Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

# Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

| | |
|---|---|
| На 1 месяц | — 90 к. |
| „ 3 „ | 2 р. 70 к. |
| „ 6 „ | 4 р. — к. |
| „ 1 год | 6 р. — к. |
| Зьмена адрасу: іншагародзяе | — 20 к. |
| мясцовыя | — 10 к. |

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

| | |
|---|---|
| За радок нашпарэлі пасьля тэксту | — р. 50 к. |
| За радок нашпарэлі пасярод тэксту | 1 р. — к. |
| За радок нашпарэлі перад тэкстам | 1 р. 50 к. |

Сьпецыяльны на 50 проц. дарожэй.

Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

| | |
|---|---|
| За 1 дакумэнт | 35 кап. |
| За кожны дадатковы | 15 „ |
| Несрадоўны 1 чырвонаармейца за дакумэнт | 15 „ |
| За кожны дадатковы | 5 „ |

Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 181 (2369) Серада, 8-га жніўня 1928 г.

## Тав. ЧЫЧЭРЫН АБ ПАКЦЕ КЕЛЁГА.

### (Гутарка з прадстаўнікамі прэсы)

**Савецкі ўрад згодзен удзельнічаць у перамовах аб пакце Келёга, калі буржуазныя ўрады сапраўды хацелі абярнуць гэты акт. ня ў зброю проці СССР, а ў спосаб абмежаваньня магчымасьці вайны. Іх жаданьне ці нежаданьне вясьці перамовы з СССР выявіць сапраўдную сутнасьць пакту Келёга.**

МАСКВА, 7-VIII. У гутарцы з прадстаўнікамі друку, Народны Камісар па замежных Справах т. Г. В. Чычэрын афіцыйным чынам выказаўся аб пакце Келёга і аб адносінах да яго СССР: Пакт званы пакт Келёга, ці больш дакладна, шматбаковы ўгавор аб забароне вайны, як сродку нацыянальнае палітыкі, стаіць у цэнтры ўвагі дыпляматычных колаў усіх краёў са часяня леташняга году. За ўвесь гэты час адбываўся жвавы абмен думкамі між дзяржавамі наконт выпрацоўкі гэтага пакту.

Не дзяржавы не падумалі запрасіць СССР да ўдзелу ў гэтых перамовах. Як відаць, кіруючыя ўрады, вялі гэтыя перамовы, не магучы падумаць аб тым, ці запрасіць СССР да ўдзелу ў іх, і, калі яны гэтага не зрабілі, дык яны мелі падставы, зусім здавальняючыя іх пункт гледжаньня. Гэтая акалічнасьць ня можа не падкрэсьліць таго, якая сапраўдная мэта ўтварэньня так званага пакту Келёга. Адхіленьне савецкага ўрада ад удзелу ў гэтых перамовах вядзіць раней усяго на думку, што сапраўдныя мэты ініцыятараў гэтага пакту, як відаць, уваходзіла і ўвалі імкненьне абярнуць яго ў сродак абмежаваньня і барацьбы проці СССР. Словы аб заключэньні так званага пакту Келёга, як відаць, зьяўляюцца складаною часткаю палітыкі абмежаваньня СССР, якая стаіць у даны момант у цэнтры сусьветных міжнародных дачыненьняў.

Дазволю сабе напомніць, што я прыехаў са сьнежаньскае сесіі Цэнтральнага камітэту па разброеньні дэлегат т. Літвінаў даў у сваім дакладзе кароткі аналіз прапаноў Келёга аб утварэньні пакту і дасканала паказаў, што забарона вайны, як сродку нацыянальнае палітыкі, ёсьць прыкрыццём для падрыхтоўкі вайны, як сусьветнае контр-рэвалюцыі.

Сапраўдная задача пакту Келёга, як яшчэ больш зразумелаю ў нас тых французскіх агаворак, аб якіх паведамлена амэрыканскім урадам у ноце 23-га чэрвеня пры рэдакцыі пакту. Французкі ўрад, рассылаючы другую рэдакцыю пакту амэрыканскім-ініцыятарам, зазначыў, што другая рэдакцыя ажыцьцяўляе французкія патрабаваньні, дык ён не бачыць: у пакце сапраўды сказана, што пакт дазваляе вайну, якая мае на мэце ўвекавечваньне існуючых угаворных адносінаў паміж нацыямі. Першае, на думку французкага ўраду, у тым, што пакт дзяйнічае сам ад сябе, незалежна ад існуючых адносін з іншымі дзяржавамі. Другая азначае, што пакт вядзе вайну для забясьпечаньня існуючых угаворных адносін. Іменна ўгаворы Францыі з Польшчаю і Румыніяй зьяўляюцца такімі, якія ўваходзяць у склад агульнае сыстэмы гэтых угаворных адносін, так што пакт для выкананьня гэтых угаворных адносін, як сродак нацыянальнае палітыкі, а вайна для ўвекавечваньня існуючых мірных і прыяцельскіх адносін між удзельнікамі пакту.

Амэрыканскі ўрад, рассылаючы другую рэдакцыю пакту амэрыканскім-ініцыятарам, зазначыў, што другая рэдакцыя ажыцьцяўляе французкія патрабаваньні, дык ён не бачыць: у пакце сапраўды сказана, што пакт дазваляе вайну, як сродку нацыянальнае палітыкі, і вайна для ўвекавечваньня існуючых мірных і прыяцельскіх адносін між удзельнікамі пакту.

У сучасны момант наш урад не атрымаў ні запросін да ўдзелу ў гэтых перамовах, ні самога тэксту прапануемага шматбаковага ўгавору, ні прапаноў, ні агаворак, пададзеных да гэтага праекту іншымі дзяржавамі. Толькі пры ўмове атрыманьня намі афіцыйнае дакумэнтацыі мы можам узяць удзел у гэтых перамовах, і, у выпадку іх спрыяючых вынікаў, узяць удзел таксама і ў падпісаньні пакту.

**Такім чынам, пакт Келёга — гэта адна з асноўных мэтаў палітыкі савецкага ўраду.** Наш урад імкнецца ў сваёй палітыцы да таго, каб вынішчыць магчымасьць якіх бы там ні было войнаў. Якіх-б ні былі ў будучыні вынікі вайны, асноўная мэта палітыкі нашага ўраду, гэта—папярэджаньне ўсякае вайны. У ліку іншых войнаў, мы імкнёмся вынішчыць таксама і тыя, якія служаць сродкам нацыянальнае палітыкі. Наш урад заўсёды цалкам згодзен, што неабходна ўжыць усе захады для таго, каб выключыць магчымасьць войнаў, якія служаць сродкам нацыянальнае ці імпэрыялістычнае палітыкі, але ён знаходзіць гэтую мяркуемую забарону іх—актам нездавальняючым. Нашая прэса шмат зрабіла, каб растлумачыць сапраўдны сэнс пакту Келёга. Брытыка пакту Келёга ў нашых вачох неабходна, і ў выпадку нашага ўдзелу ў гэтых перамовах мы прапанавалі-б неабходныя в нашага пункту гледжаньня зьмены ў гэтым пакце. Наш урад сьцьвярджае, што сам па сабе ня досыць шмат абяцаючы пакт яшчэ больш абясцэньваецца агаворкамі, зробленымі Францыяй і Англіяй; гэтыя агаворкі даюць права кожнаму ўдзельніку растлумачваць пакт у духу яго ўласнае нацыянальнае ці імпэрыялістычнае палітыкі.

Наш урад асабліва падкрэсьлівае, што пакт Келёга абясцэньваецца больш усяго тэй акалічнасьцю, што ён нічым не абавязвае ў пытаньні аб разброеньні. Яшчэ ў часе сэсіі падрыхтоўчай камісіі па разброеньні аб гэтым заявіў наш дэлегат у гэтай камісіі—т. Літвінаў.

Асноўная мэта міжнароднае палітыкі Савецкага Саюзу ёсьць захаваньне міру. Прапанова нашага ўраду аб разброеньні служыць яскравым довадам гэтае палітыкі. Наш урад ня можа ня імкнуцца выкарыстаць і амэрыканскі праект пакту, каб далей ісьці па шляху барацьбы за захаваньне ўсеагульнага міру.

Мы ня ўтойваем ад сябе, што становішча, занятае найбольш уплывовай часткаю прэсы Англіі, Францыі і Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў у гэтым пытаньні, пакідае нам мала надзеі на магчымасьць удзелу ў гэтых перамовах.

Наш урад лічыць глыбока ненармальным тую акалічнасьць, што гэтыя перамовы вядуцца без яго ўдзелу. Калі-ж ён будзе прыцягнут да ўдзелу ў гэтых перамовах, дык у такім выпадку, паўтараю, **магчымасьць удзелу нашага ўраду ў падпісаньні пакту Келёга ня выключана.**

Пакласьці канец войнам—гэта адна з асноўных мэтаў палітыкі савецкага ўраду. Наш урад імкнецца ў сваёй палітыцы да таго, каб вынішчыць магчымасьць якіх бы там ні было войнаў. Якіх-б ні былі ў будучыні вынікі вайны, асноўная мэта палітыкі нашага ўраду, гэта—папярэджаньне ўсякае вайны. У ліку іншых войнаў, мы імкнёмся вынішчыць таксама і тыя, якія служаць сродкам нацыянальнае палітыкі. Наш урад заўсёды цалкам згодзен, што неабходна ўжыць усе захады для таго, каб выключыць магчымасьць войнаў, якія служаць сродкам нацыянальнае ці імпэрыялістычнае палітыкі, але ён знаходзіць гэтую мяркуемую забарону іх—актам нездавальняючым. Нашая прэса шмат зрабіла, каб растлумачыць сапраўдны сэнс пакту Келёга. Брытыка пакту Келёга ў нашых вачох неабходна, і ў выпадку нашага ўдзелу ў гэтых перамовах мы прапанавалі-б неабходныя в нашага пункту гледжаньня зьмены ў гэтым пакце. Наш урад сьцьвярджае, што сам па сабе ня досыць шмат абяцаючы пакт яшчэ больш абясцэньваецца агаворкамі, зробленымі Францыяй і Англіяй; гэтыя агаворкі даюць права кожнаму ўдзельніку растлумачваць пакт у духу яго ўласнае нацыянальнае ці імпэрыялістычнае палітыкі.

Наш урад асабліва падкрэсьлівае, што пакт Келёга абясцэньваецца больш усяго тэй акалічнасьцю, што ён нічым не абавязвае ў пытаньні аб разброеньні. Яшчэ ў часе сэсіі падрыхтоўчай камісіі па разброеньні аб гэтым заявіў наш дэлегат у гэтай камісіі—т. Літвінаў.

Асноўная мэта міжнароднае палітыкі Савецкага Саюзу ёсьць захаваньне міру. Прапанова нашага ўраду аб разброеньні служыць яскравым довадам гэтае палітыкі. Наш урад ня можа ня імкнуцца выкарыстаць і амэрыканскі праект пакту, каб далей ісьці па шляху барацьбы за захаваньне ўсеагульнага міру.

Мы ня ўтойваем ад сябе, што становішча, занятае найбольш уплывовай часткаю прэсы Англіі, Францыі і Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў у гэтым пытаньні, пакідае нам мала надзеі на магчымасьць удзелу ў гэтых перамовах.

Наш урад лічыць глыбока ненармальным тую акалічнасьць, што гэтыя перамовы вядуцца без яго ўдзелу. Калі-ж ён будзе прыцягнут да ўдзелу ў гэтых перамовах, дык у такім выпадку, паўтараю, **магчымасьць удзелу нашага ўраду ў падпісаньні пакту Келёга ня выключана.**

*На VI кангрэсе Камінтэрну.*

## Барацьба з ваеннай небясьпекай.

**Усе прамоўцы адзначылі рост агрэсыўнасьці „іх" імпэрыялістычных урадаў у адносінах да другіх краёў і, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ, да СССР.**

**На пратэст польскага ўраду проці прамовы Бухарына РАБОЧЫЯ ВАРШАВЫ АДКАЗАЛІ МІТЫНГАМ САЛІДАРНАСЬЦІ З СССР І КАМІНТЭРНАМ.**

**Кангрэс аднагодна ўхваліў тэзісы Бэлла аб вайне.**

## Абмен думкамі па дакладу тав. Бэлла.

На раніцнім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну 4-га жніўня ішлі спрэчкі па дакладах аб барацьбе з ваеннай небясьпекай.

**Т. СТАНІСЛАЎСКІ** (*Польшча*)

гаворыць, што пратест, заяўлены польскім урадам супроць прамовы Бухарына на кангрэсе Камінтэрну, спаткаў адказ у выглядзе вялізнага мітынгу пратэсту ў Варшаве. Мітынг выказаў салідарнасьць з СССР, з VI кангрэсам Камінтэрну і пратэставаў супроць падрыхтоўкі польскім урадам вайны супроць СССР.

**Т. КОЛАРАЎ** (*Баўгарыя*)

гаворыць ад імя ўсіх дэлегацый Балканскіх краін, што Балканы зьяўляюцца вогнішчам вайны. Англія імкнецца заснаваць блёк балканскіх дзяржаў супроць СССР і дасягнула буйных посьпехаў у гэтым напрамку. Нажаль, некаторыя партыі балканскіх дзяржаў не звяртаюць вялікае ўвагі на пытаньні ваеннае небясьпекі.

**Т. МАНЖЭРЫ ПОЛЬЛІТ** (*Англія*)

адзначае, што большасьць сэкцый Камуністычнага Інтэрнацыяналу вызначаюць тэндэнцыю недаацэньваць ролі жанчын-работніц у барацьбе супроць вайны. Кампартыя павінна наладзіць масавы рух супроць вайны, які-б ахоплівай усе гушчы працоўных, у тым ліку жанчын-работніц і хатніх гаспадынь.

**Т. ЖАКМОНТ** (*Бэльгія*)

падкрэсьлівае, што ў падрыхтоўцы імпэрыялістычнае вайны супроць СССР не малую ролю грае і Бэльгія, зьвязаная тайнымі ваеннымі канвэнцыямі з французкім імпэрыялізмам.

**Т. ЛІМАНОЎСКІ** (*Польшча*)

зазначае, што арганізацыйныя посьпехі кампартыі Польшчы ў галіне антываеннае працы пакуль-што ня досыць добрыя. Антываенная прапаганда павінна быць узвязана з штодзённаю барацьбою за эканамічныя дамаганьні работніцкае клясы. Пры гэтай працы трэба пастаянна мець на ўвазе канчатковую мэту—зьнішчэньне буржуазеі.

**Т. ЧЫЛЬБУМ** (*Швэдыя*)

гаворыць, што ангельскія імпэрыялісты імкнуцца ўцягнуць у блёк супроць СССР скандынаўскія краіны, карыстаючыся тым, што ў прамысловасьць гэтых краёў укладзены буйныя ангельскія капіталы. Ідэалёгічная барацьба падрыхтоўваецца пры дапамозе буржуазнага і сацыял-дэмакратычнага друку, які вядзе нацкоўваньне на СССР.

Не зважаючы на наяўнасьць у Швэдыі моцнага пацыфісцкага руху, кампартыя Швэдыі дасягнула буйных посьпехаў у антымілітарысцкай прапагандзе.

**ТАВ. ВАСІЛЬЕЎ** (*Выканком Камінтэрну*)

зазначае, што ў спрэчках мала гаварылася аб практычных выканальні пастаноў VIII пленуму Выканкому Камінтэрну аб барацьбе з ваеннаю небясьпекаю. Самой патрэбнай практычнай задачаю зьяўляецца заснаваць апорныя пункты камуністычных партый на галоўных прадпрыемствах. Увага да гэтае працы паралізуе ў асноўе барацьбу з ваеннаю небясьпекаю. Адказы на анкету, разасланую ЦК кампартыі Нямеччыны кіраўніком заводзкіх ячэек, паказваюць, што большасьць рабочых ня верыць у блізкасьць вайны.

Антываенная праца сэкцый Камуністычнага Інтэрнацыяналу пакуль-што незадавальняючая.

У вышэйшай меры слаба вядуць партыі падрыхтоўку да пераходу на нелегальнае становішча ў выпадку абвяшчэньня вайны. Патрэбна рашучая бальшавіцкая самакрытыка зьнізу да верху. Кіраўніцтва кампартый павінна дамагацца ад ніжэйстаячых арганізацый ня толькі дакладу, але і простых довадаў праведзенае імі антываеннае працы.

**ТАВ. СЫРОЛЯ** (*Фінляндыя*)

гаворыць, што пад уплывам Англіі Фінляндыя ўсьпяк больш і больш вызначаецца в прыбалтыцкіх дзяржавамі. Варожыя адносіны Фінляндыі да СССР дрэнна прыкрываюцца заявамі аб дружбе. У Фінляндыі сацыял-дэмакраты падтрымліваюць антысавецкую палітыку фінляндзкае буржуазеі.

Фінляндзкая дэлегацыя цалкам згаджаецца з тэзісамі аб барацьбе з ваеннаю небясьпекаю, і ўносіць прапанову толькі пашырыць тэзісы ў часьці, дзе ўспаміваецца аб антываеннай працы сярод сялян, жанчын і нацыянальных меншасьцяй. Кампартыя Фінляндыі дасягнула значных посьпехаў працы ў армії. Адзак, антываенную працу ў Фінляндыі неабходна ўзмацніць.

**Т. ТАНАКА** (*Японія*)

адзначае, што японская буржуазея грае актыўную ролю ў падрыхтоўцы антысавецкага фронту, не зважаючы на двудушныя прыяцельскія заявы японскага ўраду па адрасу СССР. Японскі пралетарыят не падрыхтаваны яшчэ да барацьбы супроць вайны. Задачаю кампартыі Японіі зьяўляецца арганізаваць масы на барацьбу супроць ваеннае небясьпекі на аснове ленінскага лёзунгу абярнуць імпэрыялістычную вайну ў грамадзянскую.

На вячэрнім пасяджэньні кангрэсу 4-га жніўня працягнуліся далей спрэчкі па пытаньні аб ваеннай небясьпецы.

**ПРАМОВА Т. МІЦКЕВІЧА-КАПСУКАСА.**

Міцкевіч-Капсукас (кампартыі Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі) зазначыў:

„У лімітрофных краінах пануе ўплыў ангельскага імпэрыялізму, усё больш узбройвае гэтыя краі. Ва ўсіх лімітрофных краёх побач з рэгулярнымі войскамі існуюць магутныя добра ўзброеныя нерэгулярныя войскі,—фашысцкія аддзелы. Мэта іх існаваньня—забясьпечыць тыл, гнаць салдат наперад пры дапамозе кулямётаў.

Польска-літоўскі канфлікт усё больш завастраецца. Польшча пачынае канцентраваць сваё войска на літоўскай граніцы.

Увесь II-гі Інтэрнацыянал выказаўся за тактычнае падтрыманьне заваяваўых плянаў Пілсудзкага. Кампартыі заяўляюць, што яны зробяць усё, каб абярнуць вайну супроць СССР у грамадзянскую вайну.

* * *

Пасьля прамоў дэлегатаў Грэцыі, Палестыны, Кітаю, Сялянскага Інтэрнацыяналу, Нарвэгіі і Індыі пасяджэньне зачынілася.

## Практыка працы бальшавікоў у царскай арміі.

*Прамова т. Яраслаўскага.*

МАСКВА, 6-8. На пасяджэньні кангрэсу 6-га жніўня раніцою цягнуліся далей спрэчкі па дакладзе т. Бэлла аб ваеннай небясьпецы.

Выступалі: т. Дзімітраў (Баўгарыя), т. Энгдал (ПАЗШ), т. Фіал (Аўстрыя), т. Чжэн-Гуан (Кітай), і т. Спэктар (Канада).

Потым слова дадзена т. Яраслаўскаму, якому дэлегаты кангрэсу наладжваюць бурную авацыю.

Я хацеў-бы падзяліцца з вамі—гаворыць Яраслаўскі—практыкаю нашае партыі ў рабоце ў арміі. Калі наша партыя знаходзілася ў падпольлі, дык нам даводзілася весьці гэтую працу ў надзвычайна цяжкіх умовах. У нашай працы, якую ў гэтай галіне мы распачалі ў 1902-1903 г. г., цэнтр цяжару быў перанесен на маладых рабочых прызыўнога ўзросту. Нашыя арганізацыі разьмяркоўвалі сярод навабранцаў лістоўкі, і мы ўтварылі каля 20 нелегальных салдацкіх газэт. Мы ўзялі пад увагу, што склад арміі не аднастайны, і праводзілі нашую працу ў асобных часьцях арміі і, асабліва, у артылерыі і тэхнічных войсках, у якіх заўсёды было шмат працы. Мы выкарысталі бяспраўнае становішча салдат і палачную дысцыпліну, якая панавала ў арміях. Мы падрыхтавалі салдацкія гушчы, каб яны былі падрыхтаваны ў любы момант паўстаць супроць капіталістычных дзяржаў, аднак, сачылі за тым, каб ня было выпадкаў неабяцаючых посьпеху бескарысных бунтаў, бо паражэньне гэтакіх частковых выбухаў у выніку прыносіць бескарысную страту анэргіі.

Мы змаглі пры найцяжэйшых умовах падполья склікаць канфэрэнцыі нашых ваенных арганізацый. Здараліся і правалы гэтакіх канфэрэнцый, аднак яны мелі вялічэзнае значэньне для працы ў арміі. Мы імкнуліся ўцягваць у нашу арганізацыю абсалютна верных афіцэраў—як тэхнічных дарадчыкаў, інструктароў і г. д.

Дакладнае вывучэньне сіл працаўніка зьяўляецца неабходнаю прадпасылкаю пасьпешнае барацьбы в ім. Камуністычныя партыі павінны падыйсьці да працы ў барацьбе супроць вайны в большаю адвагаю, чым да гэтае пары. Патрэбна зьвярнуць большую ўвагу на т. зв. каляровыя войскі, чым да гэтае пары, і ўвязаць в штодзённай агітацыяй барацьбу супроць уціску работніцкае клясы ў капіталістычных краёх, барацьбу з падрыхтоўкаю імпэрыялістычнае вайны супроць СССР.

Я лічу патрэбным, каб кангрэс прапанаваў выканкому Камінтэрну выдаць літаратуру, якая-б пазнаёміла з практыкаю працы бальшавікоў у арміі і флёце, а таксама з практыкаю і ўрокамі мінулае імпэрыялістычнае вайны. (Бурныя воплескі).

Прамоваю т. Яраслаўскага спрэчкі па дакладзе т. Бэлла скончыліся.

## Заключнае слова т. Бэлла.

Потым выступіў з заключным словам т. Бэлл.

Пытаньне аб надыходзячай імпэрыялістычнай вайне—пачаў т. Бэлл—займала цэнтральнае месца ў працы 6-га ўсясьветнага кангрэсу. Толькі невялікая частка выступаўшых прамоўцаў палемізавала в тэзісамі, прапанаванымі мною. У спрэчках выявілася, што большасьць таварышоў у агульным і цэлым далучаюцца да асноўных момантаў тэзісаў.

Тая частка тэзісаў, у якой гаворыцца аб Лізе Нацый, і якую крытыкаваў т. Фэрра, на нашую думку, зусім выразна даказвае, што **Ліга Нацый зьяўляецца сродкам падрыхтоўкі імпэрыялістычнае вайны.** Зразумела, гэта можна яшчэ больш падкрэсьліць некалькімі дадаткова-ўведзенымі фармулёўкамі.

Што-ж датычыць „каляровага войска", аб якім гаварыў т. Яраслаўскі, дык зусім відавочна, што мы павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу па гэты комплекс пытаньняў і працы сярод калёніяльнага войска.

У тэзісах адзначаны важнасьць працы сярод нацыянальных меншасьцяў і арганізацыі маракоў. Мы не павінны недаацэньваць значэньня працы ў наёмных арміях. Лёзунг байкоту наёмных арміяў, высунуты ў тэзісах, бязумоўна правільны. Ён цалкам супадае—заўважае т. Бэлл,—з поглядамі Леніна на гэтае пытаньне.

Мы ведаем, што сацыял-дэмакратыя і рэфармісцкая прафсаюзная бюракратыя падтрымліваюць буржуазею ў падрыхтоўцы вайны. Нашая задача—у выкрываньні сапраўднае мэты буржуазеі і перашкодах пасылцы войск. У той-жа час мы павінны перашкодзіць вярбовачнай працы сярод рабочых.

Мы абавязаны ўсімі сродкамі паслабіць буржуазею і перашкодзіць вядзеньню вайны. Для гэтага мы павінны арганізаваць адпор вайне, у першую чаргу, на прадпрыемствах. Цэнтральнаю ідэяю тэзісаў зьяўляецца ператварэньне імпэрыялістычнае вайны ў грамадзянскую. Братаньне ня ёсьць самамэта, а толькі сродак для разрыву магутнасьці імпэрыялістычных армій. Лёзунг аб арганізацыі пралетарскае міліцыі зусім правільны. Замена яго лёзунгам «міліцыя працоўных» выклікала-б толькі блытаніну.

Апошняя шалёная кампанія проці СССР у Польшчы ізноў пацьвярджае, што пытаньне аб вайне зьяўляецца цэнтральным пытаньнем нашага часу. Наш абавязак—падтрымліваць савецкі ўрад у яго імкненьні захаваць мір і ўзмацніць нашую барацьбу проці імпэрыялістычнае вайны. Я спадзяюся, што калі мы, выконваючы ўсе гэтыя задачы, рашуча павядзём гэтую працу, дык, у выпадку выбуху вайны, фронт сацыяльнае рэвалюцыі ва ўсіх краёх, бязумоўна, пашырыцца.

* * *

Пасьля заключнага слова т. Бэлла, кангрэс аднагодна ўхваляе за аснову тэзісы аб мерах барацьбы проці ваеннае небясьпекі, прапанаваныя т. Бэллам. Тэзісы перададзены для далейшае распрацоўкі ў спэцыяльную камісію.

Наступнае плянарнае пасяджэньне кангрэсу адбудзецца 8-га жніўня ў серэду ўвечары. У парадку дня—даклад т. Бухарына аб праекце праграмы Камінтэрну і праца Праграмнае Камісіі кангрэсу.

## Дэлегацыя кангрэсу Камінтэрну ў гасьцях у рабочых Харкава.

ХАРКАЎ, 4-8. Дэлегацыя кангрэсу Камінтэрну наведала завод сельска-гаспадарчых машын „Серп і Молат". Пасьля агляду заводу, рабочыя вячэрняе зьмены наладзілі лятучы мітынг. Выступаўшы на мітынгу т. Кашэн заявіў, што нашы посьпехі і дасягненьні напаўняюць яго радасьцю бадзёрасьцю і сілаю.

Пасьля мітынгу дэлегаты кангрэсу выступалі на сходзе ўпаўнаважаных харкаўскае каапэрацыі ў вялікай залі Ўсеукраінскага ЦВК'а. Дэлегацыі была наладжана гучная авацыя, якая ўцягнулася некалькі хвілін.

Тав. Кашэн, хвалюючыся, сказаў прамову, накіраваную супроць усясьветнае буржуазеі, якая рыхтуецца да вайны. У выпадку вайны—заявіў тав. Кашэн—французкія пралетарыі ўспомняць гэраічныя ўчынкі французкіх маракоў на чале з Марці, якія адмовіліся страляць у расейскіх пралетараў. Калі буржуазея націсьне курок, дык тым горш для яе. Мілёны пралетараў Францыі возьмуць яе тады на мушку, і сьцяг пралетарскае рэвалюцыі будзе пераможна разьвівацца над усім сьветам».

## СОТНІ ТЫСЯЧ НЯМЕЦКІХ ПРАЛЕТАРЫЯЎ ПАД СЬЦЯГАМ КАМПАРТЫІ.

### ПРОЦІ ВАЙНЫ, У АБАРОНУ СССР.

БЭРЛІН, 5-VIII. 4-га жніўня ў Люстэнгартэне адбывалася вялікая дэманстрацыя супроць вайны, наладжаная кампартыяй і чырвоным саюзам франтавікоў. У дэманстрацыі ўдзельнічала некалькі дзесяткаў тысяч чалавек. Калёны дэманстрантаў, якія сьцякаліся з усіх канцоў гораду, несьлі шматлікія транспаранты з лёзунгамі: «Ліга Нацый—ліга вайны». «Усясьветны імпэрыялізм злучаецца супроць СССР», «Імпэрыялістычную вайну ператворым у грамадзянскую» і г. д.

Грузавікі з піянэрамі імя Варашылава былі спатканы бураю гарачых авацый. Прамоўцы з 15 трыбун заклікалі да барацьбы супроць небясьпекі імпэрыялістычнае вайны, супроць каліцыйнае палітыкі сацыял-дэмакратыі, за аб'яднаньне рабочых гушчаў пад сьцягам Леніна і да абароны СССР.

У той-жа дзень адбываліся антываенныя дэманстрацыі ў Франкфурце на Майне, у Кельне, у Дусэльдорфе, Майнцы, Іене, Хэмніцы і Долье.

* * *

БЭРЛІН, 3-8. 2-га жніўня ў Бэрліне адбывалася магутная антываенная дэманстрацыя, наладжаная „Міжнародным Саюзам Інвалідаў Вайны і Працы" пад лёзунгам „Вайна імпэрыялістычнай вайне". Дэманстранты вышлі з пралетарскіх раёнах і наладзілі паход. Па дарозе дэманстранты выгукавалі: «Проч імпэрыялістычную вайну», «Дайце інвалідам неабходную дапамогу», «Рабочыя абараняйце СССР». На мітынгу выступаў старшыня Саюзу інвалідаў, намуністычны дэпутат рэйхстагу Граф.

* * *

БЭРЛІН, 4-8. Учора адбылася наладжаная камсамолам і чырвоным юнфронтам антываенная дэманстрацыя рабочае моладзі. **У дэманстрацыі ўдзельнічала вельмі значная колькасьць лева настроенае сац.-дэмакратычнае моладзі.** Выступаўшыя на мітынгу прамоўцы заклікалі рабочую моладзь змагацца з небясьпекаю імпэрыялістычнае вайны і абараняць СССР.

## КАНГРЭС РАБОЧАЕ АРЫСТАКРАТЫІ І ПРАФЧЫНОЎНІКАЎ.

### БЯЗЦЬВЕТНАЕ АДЧЫНЕНЬНЕ ЗЬЕЗДУ II-ГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ.

БРУСЕЛЬ, 5-8. Кангрэс II-га Інтэрнацыяналу адчыніўся 5-га жніўня ў Антвэрпене. Прысутнічае больш 500 дэлегатаў, пераважна з краёў цэнтральнае і заходняе Эўропы. На кангрэсе галоўным парадкам прадстаўнікі рабочае арыстакратыі і прафэсыянальных палітыкаў; лавы, прызначаныя для прадстаўнікоў з калёній—пустуюць. Калёніяльны сацыялізм прадстаўлен у асобе аднаго кітайскага студэнта з Парыжу.

У наяўнасьці ўсе вядомыя лідэры, апроч захварэўшага Гэльца і Макдональда, які паехаў у Канаду, а таксама Залускага і Бэрнштэйна, якіх ня было і на мінулым кангрэсе. Незалежная рабочая партыя прыслала правую дэлегацыю без Мэкстона і Ворквуда. У нямецкай дэлегацыі адсутнічае Паўль Леві.

Прывітальныя прамовы Гендэрсона і Вандэрвельдэ вылілі, што існуюць разнагалосьсі ў выканкоме

## Пуанкарэ пачаў разгром кампартыі

### ГВАЛТОЎНАЕ ПРЫДУШЭНЬНЕ СПРОБЫ АНТЫВАЕННАЕ ДЭМАНСТРАЦЫІ.—АРЫШТАВАНА НЕКАЛЬКІ СОТ РАБОЧЫХ.

ПАРЫЖ, 6-VIII. З прычыны забароны дэманстрацыі на вуліцах, якая была намечана на 5 жніўня ў Іўры, муніцыпалітэт гэтае парыскае ваколіцы здаў для карыстаньня кампартыі ўсе гмахі, якія знаходзіліся пад ягоным кіраўніцтвам.

5-га жніўня раніцою гэтая пастанова была апратэставана прэфэктурай Сены, якая забараніла ўсялякія сходы на ўсёй тэрыторыі дэпартаманту.

Загадам прэфэктуры ўсе грамадзкія гмахі Іўры былі адабраны з пад кіраўніцтва муніцыпалітэту і з раніцы заняты ўзброенай паліцыяй і жандармэрыяй. На ўсіх подступах у Іўры былі растаўлены паліцэйскія кардоны.

Паводле паведамленьня газэт, раніцою былі ўчынены вобыскі і арышты ў розных камуністычных арганізацыях, а таксама ў арганізацыі чырвоных франтавікоў, у саюзе запасных і рэвалюцыйнае асацыяцыі ранейшых удзельнікаў вайны. **Да 3-х гадзін дня было ўчынена звыш 500 арыштаў.** Заступнік мэра Іўры быў таксама затрыманы і адпраўлены ў прэфэктуру.

Паводле вестак рэдакцыі „Юманіце", да вечара было **арыштавана больш 2000 чалавек.** Учора затрыманыя былі выпушчаны, апроч 100 чалавек, пераважна чужаземцаў.

## Антысавецкія інтрыгі Польшчы.

*БЭРЛІН. З Парыжу паведамляюць, што Польшча, побач з сваім пратэстам саюзнаму ўраду, у зьвязку з выступленьнем Бухарына на кангрэсе Камінтэрну, прапанавала французскаму і італьянскаму ўрадам выступіць з калектыўнай нотай пратэсту супроць дзейнасьці Камінтэрну. Гэтая нота разумеецца, як пачатак пэўных мерапрыемстваў супроць нездаваленьня дамаганьняў дзяржаў.*

## Трывога Нямеччыны за лёс спакою на Усходзе.

### СПАТКАНЬНЕ НЯМЕЦКАГА ПАСЛА ФОН-ГЕША З БРЫЯНАМ.

*БЭРЛІН, 3-VIII. Паводле вестак нямецкага друку, у гутарцы між нямецкім паслом у Парыжы фон-Гешам і французскім міністрам замежных спраў Брыянам, фон-Геш зьвярнуў увагу Брыяна на небясьпеку, якая ўзнікае ў выніку абвастрэньня польска-літоўскага канфлікту. Фон-Геш падкрэсьліў, што асабліва непакоіць Нямеччыну зьезд польскіх легіянэраў, які неўзабаве маецца адбыцца 12 жніўня ў Вільні.*

## Абвастрэньне крызісу ў Гаміндане

### РАДАВАЯ МАСА СЯБРОЎ ПАРТЫІ ПАД УПЛЫВАМ ЛЕВЫХ.

ШАНХАЙ, 6-VIII. У сувязі з прыездам у Шанхай Чан-Кай-Шы, асьведамленыя газэты адзначаюць, што пленум Гаміндану зьбіраецца ў абставінах сур'ёзных цяжкасьцяў, становішча напружанае і вельмі крытычнае. Уплыў левых значна ўзрос за апошні час, і лідэр іх Чэн-Кун-Бо вельмі папулярны. Дзеячы правага крыла прымушаны прызнаць, што левыя здабылі-б рашаючую ролю ў урадзе, каб ім была дадзена магчымасьць адкрыта выступаць у гарадох.

Гэтаю боязьню тлумачацца чуткі, якія, распаўсюджваюцца цэнтрыстамі, нібы прыехаўшыя ў Кітай „эмісары камінтэрну" спрабуюць заснаваць трэцюю партыю—новы Гаміндан.

## КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАЎСТАНЬНЕ Ў ЦЬЗЯНСІ.

*ШАНХАЙ, 30-VII. Ангельская газэта «Цэнтраль Чайна Пост», якая выдаецца ў Ханькоу, паведамляе, што ў Цьзянсі стварылася сур'ёзнае становішча, бо войска паўстала і далучылася да камуністаў пад камандаю Чоу-Пон-Піна і Ю-Пэн-Ціна, каб заснаваць савецкую ўладу ў гэтай акрузе. Зносіны з Пекінам перарваны. Вайсковая ўлада Ханькоу лічыць становішча сур'ёзным, бо паўстаўшыя пагражаюць вялікаму гораду Лююан.*

*Водлуг вестак кітайскіх газэт ад 30 ліпеня, паўстаньне ня прыдушана, і вайсковая ўлада Ханькоу і Чанша пасылаюць у райён яго войска па 3-х маршрутах.*

## Японія ня прызнала анулявaньня япона-кітайскага ўгавору.

ШАНХАЙ, 2-8. Паводле вестак газэт, японскі пасол у Кітаі ўшызава зьвярнуўся да нанкінскага ўраду з нотаю, якая зьяўляецца адказам на кітайскую ноту аб скасаваньні ўгавору з Японіяй. У ноце гаворыцца, што з юрыдычнага пункту гледжаньня, а таксама ў інтэрэсах пачатых у свой час перамоў,

# У Саюзе ССР.

## Надзвычайны посьпех новае пазыкі ў Крыме.

СЫМФЭРОПАЛЬ. З усіх гарадоў Крыму паведамляюць аб гарачым спачуваньні, з якім спатканы рабочымі і служачымі выпуск другое пазыкі індустрыялізацыі. Керчанскія друкары, даведаўшыся з газэт аб пазыцы, у працягу гадзіны сабралі папярэднюю падпіску на 1.000 руб. 70 ліцейшчыкаў Керчанскага дзяржаўнага мэталёвага заводу падпісаліся на 5.000 руб. Ліцейшчык Кандрашоў падпісаўся на 500 руб.

У Сымфэропалі супрацоўнікі Дзяржбанку пастанавілі падпісацца ў залежнасьці ад велічыні зарплаты ў суме месячнае, паўтарамесячнае і двохмесячнае палучкі. Калектывы прадпрыёмстваў і ўстаноў гораду пачалі кампанію спаборніцтваў на падпіску.

## Пэрспэктывы хлебазабясьпечаньня спрыяючыя.

МАСКВА. У хлебнай управе Цэнтрасаюзу супрацоўніку ТАСС паведамілі, што пэрспэктывы забясьпечаньня хлебам у 1928-29 г. вельмі спрыяючыя. Дзякуючы добраму ўраджаю ў Паволжжы, Казакстане і Сібіру, спажываючыя райёны Саюзу хлебам забясьпечаны. Некаторае паніжэньне ўраджаю на Украіне і Паўночным Каўказе прымусіць больш узмоцнена манэўраваць хлебам, праз утварэньне хлебных рэзэрваў.

Цэнтрасаюз лічыць, што спажывецкая каапэрацыя будзе адзіным хлебаправодным каналам. Гэта забясьпечыць бесперабойную дастаўку хлеба.

## УПАРАДКАВАНЬНЕ ВАГОНАБУДАУНІЦТВА.

МАСКВА. Замест 46 паштовых вагонаў Гомзы здаў Наркампаштэлю толькі 6. Вагонабудоўныя заводы пры будове вагонаў парушаюць тэхнічныя ўмовы НКПС. Калегія НК РСІ СССР ужыла захады, каб пабудова вагонаў была прысьпешана, і каб былі вынішчаны тэхнічныя парушэньні пры іх вырабе.

# У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

## Арышты камуністаў у Слонімшчыне.

Як паведамляе «Слово» (№ 175), у Сурэвічах, Слонімскага пав. паліцыя арыштавала гэтымі днямі 8 камуністаў. Усіх арыштаваных пасадзілі ў слонімскі вастрог.

## 1000 падкідкаў за тыдзень у Варшаве.

«Роботнік» (№ 218) паведамляе, што ў Варшаве за тыдзень бывае каля 1000 выпадкаў падкіданьня дзяцей. Гэта найлепей сьведчыць аб дрэннай пастаноўцы ў Варшаве справы апекі над мацярынствам.

## Яшчэ адна лётная катастрофа.

З жніўня г. г. ля Кракава здарылася яшчэ адна лётная катастрофа. Кап. Швойкоўскі на вышыні некалькіх сот мэтраў выконваў воотры вірас, сасьлізгаючы крылом да зямлі. Калі пілёт хацеў выраўнаць апарат, адарвалася адна крыло. Апарат разьбіўся ўшчэнт, а кап. Швойкоўскі забіты.

## Беспрацоўе ў Варшаве.

Паводле афіцыйных статыстычных даных, у Варшаве ў мінулым тыдні было 8520 беспрацоўных, у тым ліку 2950 пазбаўленых працы разумовых працаўнікоў.

# У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

## Уматываваны прыгавар у справе „Грамады".

*«Дзеньнік Віл. (№ 175) паведамляе, што ўматываваны прыгавар у справе «Грамады» ўжо закончан судзьдзёю Едзевічам. Прыгавар мае 40 аркушоў, друкаваных на машынцы. У бліжэйшым часе ён быў даручаны ўсім засуджаным, пасьля чаго яны ў працягу двух тыдняў могуць падаваць апэляцыйныя скаргі.*

## Суд над камуністамі ў Беластоку.

Акруговы суд у Беластоку разглядаў 30 ліпеня справу С. Кватэра і С. Казана, абвінавачаных у выданьні камуністычнай аднаднёўкі. Кватэр прысуджан на год, а Казан на 2 гады катаржнага вастрогу.

## Чуткі аб польска-літоўскай вайне.

„Кур'ер Віл." (№ 174) піша, што на абшарах Дукштанскай і Мялегінскай гміны, Сьвянцянскага пав., дзе знаходзіцца значны процант літоўскай люднасьці, польская адміністрацыя заўважыла факт масавага пашырэньня нявыкрытымі асобамі чутак аб польска-літоўскай вайне, якая мае выбухнуць у верасьні.

## Забастоўкі ў Віленшчыне.

Гэтымі днямі ў Ігналіне выбухнула забастоўка на фабр. драўляных вырабаў. Работнікі жадаюць падвышкі платы ад 30 да 50 проц.

У Кучкурышках выбухнула забастоўка на папаровай фабрыцы. Работнікі жадаюць падвышкі платы на 15 проц.

## У віл. беларускай гімназіі.

На 1928-29 школьны год дырэктарам віленскай беларускай гімназіі мае быць С. Паўловіч, які занімаў гэтую пасаду і ў мінулым годзе. „Т-ва бел. школы" прапанавала гэтую пасаду б. дырэктару Р. Астроўскаму, але ён адмовіўся.

## Адклад суду над камуністамі.

2-га жніўня г. г. павінен быў адбыцца ў Вільні суд над 10 камуністамі на чале з П. Цьвятковым. Усе яны абвінавачваюцца па 102 арт., ч. II К. К. за быццам антыдзяржаўную працу ў кантакце з КПЗБ. З прычыны незьяўленьня галоўных сьведкаў абвінавачаньня, вядомых па працэсу „Грамады", Бабіча, Вышынскага і нам. Наваконскага суд адклаў разгляд справы да палавіны верасьня г. г.

## Яшчэ аб „Гаспадарскім Зьвязе" Я. Станкевіча.

У сувязі з зацьверджаньнем статуту «Бел. Гаспадарскага Зьвязу» на дэлю Польшчу (да апошняй пары ён быў зацьверджан толькі на Віленшчыну) на агульным сходзе ў Вільні выбран новы прэзыдыум „Зьвязу" ў складзе: старшыня інж. Гузоўскі, віцэ-старшыні: Я. Станкевіч і Ю. Мурашка, сэкратар А. Коўш. Сябрамі: А. Астроўская, М. Станкевіч і М. Вінцукевіч.

## „Беларускі Гаспадар".

«Бел. Гаспадарскі Зьвяз» Я. Станкевіча прыступае да выданьня часопісі «Беларускі Гаспадар», рэдактарам якой будзе інж. Гузоўскі. Гэты-ж «Зьвяз» мае намер адчыніць у г. Лідзе ў пачатку наступаючага школьнага году двухгадовыя гаспадарча-гандлёвыя жаночыя курсы.

## Справа беларускага тэатру ў Вільні.

„Кур. Віл." (№ 174) паведамляе, што сярод беларускага грамадянства ў Вільні чынецца стараньні ў справе адчыненьня сталага беларускага тэатру ў Вільні. У гэтым кірунку працуе вядомы беларускі артыст Шчэпеновіч, які ў 1921-23 г. многа папрацаваў па арганізацыі бел. тэатру ў Вільні.

## Пабудова тэатру ў Новаградку.

„Газэта Варшавска" (№ 229) паведамляе, што ў Новаградку будуецца тэатр, які мае быць скончаны ў верасьні г. г.

# Барацьба харватаў проці Белграду абвастрылася.

## ЗАГРЭБСКІ «КОНТР-ПАРЛЯМАНТ» ЗАСНАВАЎ К-Т ДЗЕЯНЬНЯ.

*ВЕНА, 4-VIII. 3-га жніўня ў Загрэбе скончылася сэсія парляманцкіх фракцый дэмакратаў і сялянскае партыі. Загрэбскі «контр-парлямант» засядаў тры дні. Сэсія ўхваліла заснаваць пастаянны камітэт апазіцыі і абвясьціць яго «камітэтам дзеяньня», даручыўшы яму весьці далей барацьбу супроць Белграду. На чале камітэту пастаўлены Радзіч і Прыбічэвіч. Пасьля скančэньня сэсіі, у Загрэбе адбываліся дэманстрацыі, пераважна харвацкіх студэнтаў, якія дамагаліся абвяшчэньня незалежнасьці Харваты і заснаваньня харвацкага парляманту.*

## ТЭРАРЫСТЫЧНЫ АКТ АПАЗІЦЫІ.

ВЕНА, 6-8. Як паведамляюць з Белграду, у Загрэбе на вуліцы забіты стрэлам з рэвальвэру Лістовіч—рэдактар блізкае да ранейшага прэм'ера Бунічэвіча белградзкае газэты «Адзінства». Забойца-чыгуначнік Суніч, на нацыянальнасьці харват, пры допыце заявіў, што забойства зьяўляецца помстаю за артыкулы, зьмешчаныя ў газэце «Адзінства», у якіх газэта да замаху Руніча ў скупшчыне дамагалася забойства Радзіча і Прыбічэвіча, а пасьля забойства ў скупшчыне пастаянна пагражала лідэрам апазіцыі.

Загрэбскія газэты асуджваюць забойства Лістовіча, аднак, прызнаюць прычыны, якія змусілі Суніча да забойства, зразумелымі. Урадовы друк перасьцерагае апазіцыю спыніць барацьбу з Белградам.

# Выбух у бухарэсцкай крэпасьці.

ВЕНА, 6-8. Як паведамляюць з Бухарэсту, сёньня пасьля поўдню ў форце Кацэлоў Бухарэсцкае крэпасьці здарыўся выбух, які выклікаў пажар. Узарвалася 400 буйных артылерыйскіх снарадаў, потым раптам наступіў і другі выбух.

Згодна афіцыёзнаму румынскаму паведамленьню, пажар ліквідавалі пасьля некалькіх гадзін працы. Выбух і пажар, нібы ня мелі чалавецкіх ахвяр.

# 2 КАТАСТРОФЫ ПРЫ ПЕРАЛЁЦЕ НА НЬЮ-ФАЎНДЛЕНД.

ВАРШАВА, 5-8. Польскія ваенныя лятуны Кубала і Ідзікоўскі, якія вылецелі 3-га жніўня з аэрадрому Нью-Ёрку праз Азорскія выспы ў Нью-Фаўндленд, зваліліся ў Атлянтычны акіян 4-га жніўня ў 5 гадзін дня. Самалёт разьбіўся. Лятуны выратаваны нямецкім параходам і дастаўлены ў Партугалію.

ЛЁНДАН, 4-8. Ангельскі пілёт капітан Коркні, які зноў паспрабаваў 1-га жніўня пераляцець з Азорскіх выспаў на Нью-Фаўндленд, быў падабраны з гаручага самалёту амэрыканскім параходам у 500 мілях ад Азорскіх выспаў.

# ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

## ЛЁЙД-ДЖОРДЖ ЗАСТАЕЦЦА ЛІДЭРАМ ЛІБЭРАЛАЎ.

ЛЁНДАН, 26-7. Лібэральная фракцыя парляманту перавыбрала Лёйд-Джорджа сваім лідэрам.

## Чыгуначная катастрофа.

Гэтымі днямі ў Баварыі здарылася вялікая чыгуначная катастрофа. Пасьпешны воезд наскочыў на таварны з такой сілай, што пягнік і тры асабовых вагоны ўрэзаліся адзін у другі. Пад абломкамі знойдзена 14 забітых і 35 параненых.

## Фіяско ўдалага пералёту.

ВАРШАВА, 31-VII Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: польскі самалёт пад кіраўніцтвам лятуноў Шалата і Каліны, які зрабіў беспасядачны пералёт Варшава—Багдад, праляцеўшы адлегласьць больш 3 з паловаю тысяч кілёмэтраў, пры спуску ў Багдадзе пацярпеў аварыю. Лятун Шалат забіты, Каліна і мэханік выйшлі цэлымі.

# На Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

## Больш жывой сувязі.

29-га ліпеня на пленуме РК КП(б)Б быў заслухан даклад старшыні РВК аб грамадзка-масавай працы сельсаветаў у райёне і выкананьні раней дадзеных дырэктыў. З дакладу можна было заўважыць, што, у параўнаньні з мінулым годам, грамадзка-масавая праца сельсаветаў пашырылася, але і да гэтага часу знаходзіцца ў вялікім заняпадзе.

З абсьледаваньняў выявілася, што ня гледзячы на пляны, якія ў сельсавеце маюцца, шмат чаго ня выконваецца, пасяджэньні прэзыдыуму сельсавету не адбываюцца, не запрашаюцца на пасяджэньні прымацаваныя дэлегаткі, няма вучоту актыву, камісіі непрацаздольны, а ў некаторых сельсаветах (напр., Строчыцкім) арганізацыя камісій зусім адсутнічае. Гэта тлумачыцца тым, што кваліфікацыя сельсавету зусім слабая, а падругое, ня выконваюцца дырэктывы РВК па ажыцьцяўленьні грамадзка-масавай працы. Былі выпадкі, што, калі прадстаўнікі РВК пыталіся ў сельсавеце, ці маюцца дырэктывы РВК аб грамадзка-масавай працы, дык сельсавет адказваў: „Такой не атрымоўвалі", а калі пачыналі шукаць дырэктываў, знаходзілі ў справах сельсавету.

Усё гэта гаворыць за тое,—ня толькі ў сельсаветах, але і ў РВК маюцца адказныя працаўнікі, якіх трэба стала інструктаваць у працы.

Па дакладу пленум РК КП(б)Б ухваліў цэлы шэраг практычных прапаноў, якія ў разрэзе пастаноў XУ-га партыйнага зьезду маюць на мэце найхутчэйшае ажыцьцяўленьне грамадзка-масавае працы сельсавету, заўчасную падрыхтоўку да будучых перавыбараў і падбору сталых працаздольных працаўнікоў.

Клёнік.

*Самахвалавічы, Меншчына.*

## Ажыцьцяўляем пастановы XУ партзьезду.

15 партзьезд высунуў як асноўную задачу па працы на вёсцы калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Прапрацоўваючы рашэньні XУ партзьезду, наша Бярэзінская партарганізацыя энэргічна пачала праводзіць іх у жыцьцё. У выніку чаго арганізавана камуна пад кіраўніцтвам т. Махнача, якая аб'яднала 5 гаспадарак з 11 едакоў. Камуна мае 40 дз. і ўжо набыла 4 кані і 4 штукі рагатай скаціны.

Акрамя камуны арганізаваны 4 яўрэйскія арцелі, у якія ўвайшлі 24 сям'і з 103 едакамі, якія маюць 103 дзесяціны; 10 беларускіх калгасаў, якія яднаюць 68 гаспадарак з 269 едакамі і з плошчаю каля 400 дзесяцін; 4 жывёлаводчаскія таварыствы, якія аб'яднаюць 129 гаспад. і ўжо маюць быкоў і кыроў праізводзіцеляў; 1 малочная арцель, якая ўжо мае свой сэпаратар; 1 машыннае т-ва, якое яднае 22 гаспад. і 6 мэліярацыйных т-ваў, якія пракапалі каля 17 кілём. канавы. Усё вышэй адзначае сьведчыць нам аб тым, што Бярэзінская партарганізацыя правільна падышла як да вырашэньня нацыянальнага пытаньня, так і да правядзеньня ў жыцьцё пастаноў 15 партзьезду.

С. Ч.

*Н.-Барысаў.*

## Навялі парадак у лесе.

Лупалава, 7-8. 150 дзесяцін, якія перададзены, як лес мясцовага значэньня, вёсцы Гарбавічам, Лупалаўскага райёну, гэта—не малы кавалак.

Тры гады пакутваў гэты лясок, як і пераважная большасьць усіх мясцовых масіваў значэньня.

І толькі год таму назад гарбовіцкі лес уздыхнуў вольна. Навялі ў ім парадак маладыя хлопцы-пераменьнікі, якія сталі ўпаўнаважанымі і лясьнікамі.

Цяпер няма паратунку парубшчыку. У лесасеках падрастае малады лясок. Жывёла туды не дапушчаецца.

Жывёла пушчаецца толькі ў асобна выдзелены вучастак. Авечкам зусім няма доступу ў лес.

У гэтым годзе грамадзяне зрабілі пасадку лесу на плошчы ў адну дзесяціну.

## На калектыўную працу.

Магілеў, 7-VIII. З 1-га жніўня магілеўскія абаронцы-правазаступнікі перайшлі на калектыўны метад працы. Асабіста абаронцы ніякіх спраў не бяруць і наведвальнікаў на сваіх кватэрах ня прымаюць. Усе, маючыя патрэбу ў абаронцах, зьвяртаюцца ў бюро іх, якое паступаючыя справы разьмяркоўвае паміж сваіх сяброў. Уведзены вячэрнія дзяжурствы ў бюро.

## Бярэце прыклад.

Прэзыдыум РВК ўзяў напрамак праводзіць свае пасяджэньні з выездам на вёску. Такіх выездаў робіцца 2 у месяц. Апошняе пасяджэньне адбылося ў в. Васьпавічах, Холмаўскага с.-с. На пасяджэньне зьявілася амаль уся вёска. На абвестцы дню сталі пытаньні: 1) Справаздача аб працы Холмаўскага с.-с.; 2) Інфармацыя аб земляўпарадкаваньні і розныя справы. Насельніцтва вельмі цікавілася пытаньнямі і ў вырашэньні іх прымалі шырокі ўдзел. Запытаньні і выступленьні сялян па абодвух пытаньнях далі шмат чаго карыснага прэзыдыуму РВК. Пасьля пасяджэньня райённыя загадчыкі давалі адказы на запытаньні сялянству кожны па сваіх галінах.

В. Р.

*Чавускі р., Магілеўшчына.*

## Былы абшарнік акапаўся ў сваім маёнтку.

У вёсцы Гарбавічах жыве былы абшарнік Міхайла Ігнацьцеў з сваім пасынкам Сцыбла, якіх, чамусьці, не дакануўся дэкрэт аб высяленьні.

Маюць яны зямлі колькі трэба, уволю, і яшчэ арандуюць млын на рацэ Рэкце.

У 1928 годзе, калі ў Гарбавічах пачалі апэраваць банды «зялёнаўцаў», Ігнацьцевы некуды зьнікілі, але ў 1920 годзе зноў зьявіліся...

Самі яны і ня думаюць працаваць на ўласнай зямлі.

Батракоў наймаюць па некалькі чалавек, а самі толькі пахаджваюць «ручки в брючки»...

Пасынак-жа Сцыбла Ляксей і ня жыве зусім у Гарбавічах, а ўтрымоўвае прыватную харчэўню ў Магілеве. Зямля-ж за ім лічыцца.

Які-ж гэта парадак?.. Акруговы земаддзел павінен зьвярнуць увагу на гэта і пазбавіць памешчыка зямлі.

Л—ы.

*Лупалаўскі р., Магілеўшчына.*

## Навошта лішнія людзі?

Беларуская мова для ўсіх установаў Бабруйскай акругі абавязкова і ўсе яе ўжываюць.

А вось гэткая ўстанова, як Дзяржшвэймашына ў гор. Бабруйску, якая непасрэдна мае сувязь з сялянствам, дык служачыя яе (жанчыны) ня толькі ня імкнуцца да белмовы, а наадварот, цярпець яе ня могуць, і калі той ці іншый селянін, жадаючы што небудзь купіць, і запытае пабеларуску, дык яго як быццам і ня чуюць.

Уся гутарка, перапіска канцэлярыі робіцца выключна на расейскай мове і імкненьня да пераходу на белмову ня чуецца.

Служачыя, акрамя загадчыка, калі зайсьці каля 10 гадзіны раніцы, таксама не заўсёды к гэтаму часу прыходзяць (крама адчыняецца а 9 гадзіне).

Прычына гэтаму мабыць—малая нагрузка, дык тады, калі двум няма чаго рабіць, мабыць мэтазгодна зрабіць скарачэньне.

Ведаючы.

*Бабруйск.*

## Уборка жыта распачалася.

З 27 ліпеня пачалася масавая жатва азімага жыта. Надвор'е для жатвы перш было спрыяючае, а цяпер пад канец жатвы кепскае. Ужо пачэлася ўборка азімых, пры абмалоце першых снапоў на новы хлеб ураджай аказаўся вышэй сярэдняга, а мясцамі і зусім добры. У сувязі з такім ураджаем і масавай уборкай—хлеб на рынку значна патаньнеў—у два-тры разы. Становішча яравых пасеваў за апошнія лікі ліпеня і пачатку жнівеня значна палепшыліся, прымячаецца рост аўсу і бульбы нябывалы. Наогул, сёлета ўраджай будзе в-сярэдняга.

„Статкор".

*Рагачоўскі р., Бабруйшчына.*

## Кульгавая беларусізацыя.

Ня гледзячы на цэлы шэраг пастаноў аб ужываньні ў штодзённай працы беларускай мовы, гэтыя пастановы пакуль што не знайшлі належнай увагі ва ўстановах гораду Рагачову.

Возьмем к прыкладу працаўнікоў каапэрацыі. Калі ад іх пачуеш беларускае слова, дык гэта—вялікае дасягненьне. Як у праўленьні, так і ў крамах працаўнікі гавораць на «панскай» мове.

У крэдытным с.-г. т-ве, дзе сялян бывае многа кожны дзень, ад супрацоўнікаў т-ва беларускай мовы таксама не пачуеш. Аб прафсаюзах гутарыць ня прыходзіцца. Тут усе ведаюць, што белмову абавязкова трэба вывучаць, пісаць паперкі пабеларуску, але гутарыць з даведчыкамі чамусьці забываюць (страхкаса). Гэта так сказаць, унутраны бок беларусізацыі Рагачову. Надворны бок зьяўляецца ня лепшым паказчыкам гэтага становішча. Толькі дзьве шыльды—РВК і кнігарні красуюцца па гораду намаляванымі на беларускай мове, а больш, як быццам, ва ўсім Рагачове і ня знойдзецца.

Прыкра і соромна неяк робіцца ад гэткай беларусізацыі.

Я. Крушына.

*Рагачоўскі р., Бабруйшчына.*

## Узмацніць антырэлігійную прапагандну.

1 жніўня адбылася нарада бязбожнікаў г. Барысава, на якой тав. Пакроўскі зрабіў даклад на тэму—задачы антырэлігійнай прапаганды. На нарадзе прысутнічала каля 100 чал.

Пасьля дакладу разгарнуліся шырокія спрэчкі, у якіх асабліва актыўна выступалі настаўнікі Барысава. У спрэчках выявілася, што антырэлігійная работа як у горадзе, вайсковых часьцях, так і ў вёсках амаль што зусім не праводзіцца і што гэтае скарысталі папы, ксяндзы і рабіны. Напрыклад: калі польская школа ўздумала арганізаваць піянэратдад, дык ксёндз пашоў па хатах і пачаў праводзіць работу сярод бацькоў, каб яны ня пушчалі дзяцей у піянэры. Такім чынам вывялася, што і ў г. Барысаве і бліжэйшых вёсках «пастыры» хрыстовы пачынаюць актыўней весьці работу сярод сваей паствы.

Адзін рабочы, выступаючы ў спрэчках і адзначыўшы слабасьць праводзімай антырэлігійнай работы, сказаў: «Няхай наша сёнешняя нарада зьявіцца пачаткам актыўнага разгортваньня антырэлігійнай работы сярод працоўных». Гэтыя словы павінен запомніць кожны і актыўна ўзяцца за работу.

Чэрнікаў.

*Г. Нова-Барысаў.*

# 2-я пазыка індустрыялізацыі.

## Задача культурных сіл вёскі.

Побач з пашырэньнем індустрыялізацыі нашай прамысловасьці, побач з пашырэньнем жыльлёвага будаўніцтва ў бягучым годзе мы падыйшлі да неабходнасьці перабудовы сельскай гаспадаркі.

Перад намі стаіць неадкладная задача ўзмацненьня і разьвіцьця сялянскай гаспадаркі і павышэньня ўраджайнасьці сялянскіх палёў. Дзеля гэтага неабходна павялічыць асыгнаваньні на земляўпарадкаваньне, мэліярацыю, перасяленьне, на ўтварэньне насеннага фонду і г. д. Апрача таго, на чарзе стаіць пытаньне аб садзейнічаньні разьвіцьцю калектыўных гаспадарак, якія змогуць даць больш-менш значны эфэкт у галіне павялічэньня прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Аграмадная і адказная задача індустрыялізацыі краіны і ўзмацненьня сельскай гаспадаркі патрабуе ня толькі максымальнага скарыстоўваньня ў гэтым напрамку дзяржаўных сродкаў, але і сродкаў усяго насельніцтва, якое моцна зацікаўлена ў падняцьці вытворчай магутнасьці краіны.

Дзяржава ня можа, ды і ня мае столькі сродкаў, каб забясьпечыць такі шырокі размах нашага будаўніцтва ва ўсіх галінах гаспадаркі. Нехапаючыя для будаўніцтва ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы сродкі неабходна сабрацьць шляхам прыцягненьня зьберажэньняў насельніцтва ў дзяржаўныя пазыкі.

Вопыт рэалізацыі 1-й пазыкі індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі сярод рабочых, служачых і сялян паказаў, што справа індустрыялізацыі краіны, справа падняцьця і ўзмацненьня сальскай гаспадаркі аднадушна падтрымоўваецца ўсімі працоўнымі Саюзу.

2-я пазыка індустрыялізацыі выпускаецца на 500 мільёнаў рублёў. П[illegible] ўсяму Савецкаму Саюзу налічваецца звыш 10.000.000 членаў прафсаюзаў і да 25.000 тысяч сялянскіх гаспадарак. Толькі прыцягненьне да справы будаўніцтва народнай гаспадаркі ўсёй гэтай масы працоўных забясьпечыць посьпех 2-й пазыкі індустрыялізацыі.

Як ужо вядома, БССР з агульнасумы павінна будзе рэалізаваць новую пазыкі на 5.400.000 руб., з якіх 1.200.000 руб. мяркуецца рэалізаваць у сельскіх мясцовасьцях.

Савецкая Беларусь пазыкў ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі рэалізавала на 2.400.000 руб. Адгэтуль надаць, што сума, вызначаная к рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі сельскіх мясцовасьцях, значна меншая. Хоць гэта сума і значна меншая, а разам з тым трэба асабліва дакладна паставіць агітацыйна-арганізацыйную працу па разьмяшчэньню гэтай пазыкі. Гэта вельмі важна таму, што пр[illegible] правядзеньні кампаніі па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на мясцох былі дапушчаны [illegible] каторыя перагібы і шурпатасьці.

У часе правядзеньня кампаніі [illegible] рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі трэба ўмела і разумна пастав[illegible] агітацыйную працу, працу па тлум[illegible]чэньню сялянству значэньня дзяржаўных пазык, каб былі расьсеяны [illegible] настроі, якія ў некаторых мясц[illegible] утварыліся пры рэалізацыі пазы[illegible] ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

У гэтай вельмі важнай і адказн[illegible] працы павінна прыняць самы актыў[illegible] ўдзел наша вясковае настаўніцт[illegible] агранамічныя сілы, а таксама праце[illegible]ніві лясьніцтваў і іншыя культурн[illegible] сілы вёскі. Праца гэта вельмі вяліз[illegible] і адказная, але нашы культурныя [illegible]лы вёскі з ёю павінны справіцца.

## За 3 дні падпіска дала 20000 руб.

Віцебск, 7-8. *Не зважаючы на тое, што падпіска на другую пазыку індустрыялізацыі фактычна распачнецца толькі з 1 верасьня, ужо можна адзначыць некаторыя папярэднія вынікі падпіскі на пазыку.*

*За апошнія тры дні працоўныя Віцебшчыны падпісалі на новую пазыку на су[illegible] больш 20000 руб., што д[illegible] падставу меркаваць аб забя[illegible]печаньні посьпеху другой пазы[illegible] індустрыялізацыі.*

## Падпіска праходзіць з посьпехам.

(Завод «Двигатель Революции», Гомель).

*Падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на нашым заводзе ідзе ўжо трэці дзень. Толькі ў першы дзень падпіска сярод рабочых дала 6210 руб., ці ў 2 разы болей, чым дала першая пазыка індустрыялізацыі.*

*Шэраг рабочых падпісаліся на новую пазыку на суму, якая значна больш іх месячнага заработку.*

*Беспартыйны рабочы, т. Сьвірыдаў, падпісаўся на 225 руб., на 200 руб. (кожны) падпісалі т. С. Уліцін і камсамолец С[illegible]лівончык.*

*Трэба сказаць, што рабочыя [illegible] служачыя заводу праяўляю[illegible] надзвычайную зацікаўленасьць [illegible] 2-ой пазыкі індустрыялізацыі, таму мяркуем, што на наш[illegible] заводзе будзе рэалізавана па[illegible]кі ня менш як на 15-16000 р[illegible] а гэта ўжо будзе ў 5 раз[illegible] больш, чым было пры рэалізаці[illegible] першай пазыкі.*

Г—п.

## ПАДПІСАЛІСЯ НА 100 ПРОЦ. МЕСЯЧНАЙ ЗАРПЛАТЫ.

ВІЦЕБСК, 7-8. Супрацоўнікі акрсаюзу спажывецкай каапэрацыі ў ліку 75 чалавек падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі ў разьмеры 100 проц. месячнай заработнай платы на агульную суму ў 6500 рублёў.

## Па ініцыятыве рабочых.

НОВАБЕЛІЦА, 7-8. Па ініцыятыве рабочых распачалася падпіска на пазыку на заводзе „Чырвоны Хэмік". Падпіска праходзіць з посьпехам,—некаторыя рабочыя падпісваюцца больш чым на месячную зарплату. Рабочы Марчэнка, які зарабляе ў месяц 70—75 руб., падпісаўся на 300 рублёў.

## 535.000 руб. дасьць Магілеўшчына.

МАГАІЛЕЎ, 7-8. Па Магілеўскай акрузе маркуецца рэалізаваць 2 паз. індустрыялізацыі на 535.000 руб. Сярод рабочых і служачых па калектыўнай падпіскі маркуецца рэалізаваць аблігацый на 300.000 руб., у сельскіх мясцовасьцях—на 175.000 р., а рэшта сярод неарганізаванага насельніцтва.

## ПАДПІСАЛІСЯ НА 7555 РУБ.

МЕНСК, 7-8. Калектыў працаўнікоў Менскага Акрфа распачаў падпіску на пазыку індустрыялізацыі. У першы-ж дзень 103 працаўнікі падпісаліся на 7555 руб., ніхто з працаўнікоў не падпісаўся ніжэй 100 проц. месячнай пенсіі, а некаторыя падпісаліся на разьмеры паўтарамесячнай зарплаты.

## Падрыхтоўка да пазыкі.

Магілеў, 7-VIII. Акруговы фінадзел зьвярнуўся да райвыканкомаў з просьбай устанавіць да 15—20 жніўня сетку кантрагентаў па распаўсюджваньні другой пазыкі індустрыялізацыі. Працаюць кіруюць [illegible] выканкомы, якія прыцягваюць сельсаветы, а апошнія вылучаюць контр-агентаў (арганізацыі, аўтарытэтных асоб з сялян, настаўніцтва і г. д.).

Кантрольная лічба для нашай акругі складае 535 тысяч рублёў, з якіх 300 тысяч рублёў прыпадае на рабочых і служачых. 175 тысяч—на вёску і 60 тысяч—на неарганізаванае насельніцтва.

# САЦЫЯЛ-ДЭМ. ПАРТЫЯ ПОЛЬШЧЫ і ЛІТВЫ і ППС.

Марксысцкая думка пачынае прасякаць у Польшчу ў 70-х гадох праз партыю «Пралетарыят». Пасьля разгрому гэтай партыі ў 1886 г. у рабочым руху Польшчы пачынаецца некаторае зацішша, якое цягнецца да пачатку дзевяностых гадоў. Толькі дзені-дзе засталіся яшчэ асобныя гурткі. У 1890 г. у Польшчы зноў пачынаецца масавы рух. У гэтым годзе арганізаваўся рабочы саюз Польшчы, які зьяўляўся тыповай масавай арганізацыяй рабочай клясы. Гэты рабочы саюз быў арганізатарам эканамічнай барацьбы, змагаўся за палепшаньне матар'яльнага становішча рабочай клясы і, як яўрэйскія сацыял-дэмакратычныя групы ў Вільні, Менску і іншых гарадох Беларусі, пачаў арганізоўваць у розных цэхах баявыя касы. У 1892 годзе гэты саюз праводзіць цэлы шэраг вабастовак. Слабым бокам рабочага саюзу было тое, што ён займаўся, галоўным чынам, эканамічнай барацьбой, а не палітычнай.

У 1892 годзе рабочы саюз быў разгромлен паліцыяй, і ў польскім рэвалюцыйным руху зноў пачынаецца зацішша. Адначасна адбываецца раскол у шэрагах польскага рэвалюцыйнага руху, у якім намячаюцца два напрамкі.

Першы напрамак групаваў вакол сябе пераважна польскую рэвалюцыйную інтэлігенцыю, якая прызнала, што польская рабочая кляса можа вызваліцца толькі пры незалежнай Польшчы, а не змагаючыся побач з рабочай клясай усёй Расеі. Таму—гаварылі яны—польская рабочая кляса павінна ў першым этапе свайго вызваленчага руху змагацца за незалежнасьць Польшчы. Для хутчэйшага дасягненьня гэтай мэты яны раілі саюз рабочай клясы з сялянствам і рэвалюцыйнай інтэлігенцыяй.

З гэтага напрамку ў 1893 годзе стварылася «Польская Сацыялістычная Партыя» (ППС), якая паставіла перад сабой задачу арганізаваць польскі рабочы рух на нацыянальных падставах, распаўсюджваючы, такім чынам, шавіністычныя дробна-буржуазныя ідэі сярод польскіх працоўных пад маскай сацыялізму.

Другі напрамак, групуючы вакол сябе перадавых рабочых, заяўляў, што **вызваленьне рабочай клясы зьяўляецца справай толькі самой рабочай клясы, і што ў сваёй барацьбе польскі рабочы павінен аб'яднацца з пралетарыямі ўсяго сьвету,** што ідэя барацьбы за незалежнасьць Польшчы зьяўляецца шкодная, бо яна запяняе масавую самасьвядомасьць рабочай клясы. З гэтага напрамку пасьля стварылася **«Сацыял-дэмакратычная партыя царства Польскага».** Гэта партыя лічылася выключна тэрытарыяльнай арганізацыяй, якая арганізоўвала рабочых Польшчы для супольнай барацьбы в расейскім пралетарыятам за вызваленьне працоўных. Заснавальнікамі партыі былі—Р. Люксэмбург, Мархлеўскі, Варскі (Яніцэс Ціпко) і інш. Яна ўжо з самага пачатку далучылася да рэвалюцыйнага марксызму і пачала весьці энэргічную барацьбу супроць шавінізму ППС, якая ўжо вяла ў той час шырокую працу ў Польшчы.

Да стварэньня РСДРП—ПСД была адзінай рэвалюцыйна-марксысцкай арганізацыяй у Польшчы і Беларусі, асабліва ў Беластоку, але яна мела слабыя сілы, яна цярпела ад поўнай адсутнасьці інтэлігентных сіл і матар'яльных сродкаў.

У 1896 г. былі арыштаваны амаль усе сацыял-дэмакратычныя агітатары, і дзейнасьць польскай партыі прыпынілася. Ажыўленьне ў шэрагах ПСД пачынаецца толькі в 1899 г., калі гэта партыя аб'ядналася з саюзам літоўскіх сацыял-дэмакратаў і замест свайго старога імя «Сацыял-дэмаратычная партыя царства польскага» набыла назву **„Сацыял-дэмакратычная Партыя Польшчы і Літвы".** Ад гэтага часу яна пачынае карыстацца вялікім уплывам на рабочыя масы Польшчы. Адным з правадыроў СДПП і Л быў тады **т. Фэлікс Дзяржынскі,** які працаваў у Віленскім райёне. У шэрагах СДПП і Л. знаходзіліся таксама прадстаўнікі і іншых нацыянальнасьцяй—беларусы, яўрэі і літоўцы.

Напярэдадні рэвалюцыі 1905 г. у Расеі, узьнімуся і рэвалюцыйны рух у Польшчы. Расейска-японская вайна выклікала прамысловы крызіс у Польшчы і вялікае бесспрацоўе ў польскіх і беларускіх гарадох. Гэта паслужыла штуршком для лютай барацьбы рабочай клясы супроць царскага ўраду і яго палітыкі вайны. Сацыял-дэмакратыя Польшчы і Літвы скарыстала становішча, і ў сваёй агітацыі зазначала, што толькі ўзброеныя паўстаньні зьяўляюцца адзіным выхадам з гэтага становішча, што толькі ўзброенай рукой можна будзе дамагчыся нізрынуцьця царызму. Але СДПП і Л уяўляла сабе ўзброенае паўстаньне, як вынікі стыхійнага разьвіцьця рэвалюцыйнай барацьбы, але ня як арганізаванае выступленьне, якое павінна быць падрыхтавана загадзя, таму СДПП і Л выступала супроць тэхнічнай падрыхтоўкі паўстаньня, супроць арганізацыі баявых дружын.

Аднак, у агні рэвалюцыі СДПП і Л была змушана адмовіцца ад гэтай пазіцыі і пачала загатаўляць зброю і арганізоўваць баявыя дружыны. У ліпені 1905 г. яна становіцца на чале лёдзінскага ўзброенага паўстаньня, якое цягнулася 

# Рыхтуемся да здачы сельска-гасп. падатку

## Вучот аб'ектаў скончан.

(Полацкая акруга).

Вучот па сельска-гаспадарчаму падатку па акрузе скончан. У сучасны момант амаль што заканчваецца праверка вучоту, налічэньне падатку і перадача акладных лістоў. Ёсьць датэрміновае паступленьне падатку.

Дзякуючы лепшай падрыхтоўцы да кампаніі, як, напрыклад, праведзеньне курсаў працаўнікоў сельсаветаў перад пачаткам вучоту, належнай увазе да выбару прадстаўнікоў ад плятнікаў у сельскія падлічальныя камісіі і больш сталаму нагляду і кіраўніцтву вучотам з боку райвыканкому,—папярэднія даныя аб выніках вучоту сёлета сьведчаць аб дасягненьнях. Напр.: пахаці сёлета падлічана больш на 9318 дзес., ці 3,8 проц., сенажаці—на 5699 дзес., ці 4 проц., рагатай жывёлы — на 5155 галоў, ці 5,5 проц., коняй—на 1290 шт., ці 2,4 проц., сьвіней—на 17365 шт., ці 35,1 проц., авечак усяго падлічана па акрузе 120146 шт.

Па неземляробскіх прыбытках падлічана больш на 1592219 руб., ці 88,8 проц. супроць мінулага году. Лепшае выяўленьне неземляробскіх заробткаў адзначаецца ў Валынецкім, Дрысенскім, Вушацкім і Полацкім раёнах.

У выніку вучоту агульная сума прыбытковасьці па акрузе ад усіх галін сельскае гаспадаркі павялічваецца супроць мінулага году на 2000911 р., ці на 13,8 проц.

У працягу праверкі вучоту за ўтойваньне аштрафавана па акрузе 1514 гаспадарак, накладзена на іх штрафу 13615 р. Спагнана гэтага штрафу пакуль што 1915 р. в 243 гаспадарак. Райвыканкомы павінны зьвярнуць увагу на тэрміновае спагнаньне гэтага штрафу, аб чым ім дадзена адпаведнае ўказаньне.

Усяго па акрузе арыентыровачна намечана для індывідуальнага абкладаньня 1298 гаспадарак, між тым райвыканкомамі супольна з сельсаветамі выяўлена пакуль што 276 гаспадарак. Райвыканкомам дадзена ўказаньне зьвярнуць на гэтую справу асаблівую ўвагу.

Сёлета па акрузе мяркуецца звольніць ад падатку 26952 бяднэйшых гаспадарак, што складае 40 проц. усіх гаспадарак акругі.

Налічэньне падатку па акрузе яшчэ ня скончана, прычым, па падліку па 16 сельсаветах акругі павялічэньне падатку супроць мінулага году па гэтых сельсаветах дасягае 21 проц.

Трэба адзначыць, што, наогул, вынікі вучоту ў сёлетнім годзе здавальняючыя.

Чарговая задача сельсаветаў і райвыканкомаў у сучасны момант зьяўляецца: своечасовая перадача акладных лістоў, правядзеньне растлумачальнае кампаніі аа датэрміновую здачу падатку і своечасовы разгляд у падатковых камісіях паступаючых скаргаў і хадайніцтваў.

Мартынкоў.

## Беднята, даволі маўчаць!

У нашай вёсцы ёсьць заможнікі, якія маюць па дзесяціне ўтоенай зямлі, якая ўзорана на вурочышчы «Маркава».

Там калісь быў лес, але да вайны яго выкарчавалі і вурочышча было сенажацьцю.

У час вайны яго ўзаралі і з дзесяціны бяруць на 60-75 пуд. жыта і яшчэ розная збожжа. Усяго там утоена 5 дзесяцін зямлі.

Апрача таго, заможнік Мікіта Пікулік займаецца сталярствам і за гэты час зарабіў 75 руб.

Яго сталярства таксама ўтоена ад абкладаньня падаткам.

Клёнік.

*В. Бардзілаўка, Меншчына.*

## Прыбыткі павялічыліся на 3 млн. руб.

(*Ліст з Бабруйску*)

Праца па вучоту аб'ектаў абкладаньня на акрузе скончана. Цяпер можна зрабіць канчатковую ацэнку яе правядзеньня і падлічыць вынікі. Вынікі і добрыя і кепскія. Добрымі вынікамі трэба лічыць тое, што ў сёлетні вучотны сезон Бабруйшчына здолела даць павялічэньне аб'ектаў супроць мінулага году: пахаці на 38440 дзесяц., сенажаці на 34006 дз. кароў—на 6804 шт, коняй—на 5431 галаву, сьвіней—на 47000 штук і неземляробчых заробкаў—на 1.510 тысяч рублёў.

Лічбы выяўленьня пахаці і сенажаці яскрава сьведчаць аб тым, што ў большасьці райёнаў праца гэта праходзіла добра. Нельга гэтага толькі сказаць пра Сьвіслацкі, Клічаўскі, Глускі і Слуцкі раёны. Тут праца ішла слаба і значных вынікаў (станоўчых) мы ня маем.

Павялічэньне ў вучоце кароў і наогул рагатае жывёлы супроць мінулага году трэба лічыць недастатковым. Асабліва кепска ў гэтай галіне праводзілі Асіповіцкі, Парыцкі, Слуцкі, Любаньскі, Глускі і Чырвона-Слабодзкі раёны. Сельскія праверачныя камісіі і тут хоць і іспавалі, але карысьці не далі, бо праверачная праца не вялі.

Выяўленьне нашні было зьвязана з вялікімі цяжкасьцямі і праводзілася шляхам фактычнага абмеру зямлі. Абмер на працягу тэрміну вучоту, згодна зьвестак ад 8 райёнаў, праведзен ў 264 вёсках і насельных пунктах, чым выяўлена звыш 15 тыс. дзесяцін зямлі. Любаньскі, Жлебінскі, Старобінскі і Старадорожскі раёны ў справе выяўленьня ўкрытае зямлі і наогул у правядзеньні вучоту аказаліся самымі актыўнымі, добра паставіўшы працу.

Дзякуючы выяўленьню аб'ектаў на акрузе мы маем тое, што звыш 3 мілёнаў рублёў новых прыбыткаў, якія раней ня ўлічваліся, сталі ўлічвацца ў падатак. А апрача гэтага выяўленьне дало магчымасьць правільней разьмеркаваць цяжар падатку сярод асобных груп сялянства. У вучотнай практыцы меліся выпадкі, што вёскі запісвалі ў падатак толькі палову, а то і яшчэ менш сваёй зямлі. Так, у вёсцы Арлева, Любаньскага райёну, замест 10 дзесяцін, якія запісываліся пры вучоце на надзел, знойдзена 20 дзес; у Раманавай Слабадзе Парыцкага райёну замест 10, знойдзена 27 дзесяцін і г. д.

Хібамі працы трэба адзначыць слабу праведзеную працу па выяўленьні заможных гаспадарак для абкладаньня ў індывідуальным парадку. Усяго на акрузе такіх гаспадарак выяўлена 1001, прычым некаторыя райёны, напрыклад, Асіповіцкі, не прадставілі для гэтага ніводнае гаспадаркі.

Для аслабаненьня ад падатку за кошт скідачнага фонду па 10 райёнах вызначана 17743 гаспадаркі, што складае 21 проц. агульнага ліку гаспадарак. Тут відаць, што заданьне аб 35 пр. аслабаненьні беднаты ад падатку ня выканана.

Цяпер на мясцох пашла праца па налічэньні падатку. К 15 жніўня акладныя лісты будуць уручаны плятнікам.

Ч. Дамброўскі.

## Папоўскія камбінацыі.

Попы радзінскай царквы гр-н Дзьмітрок Такавой, маючы гаспадарку, даведаўшыся, што сельвучоткамісіяй вучцёны дасканальна ўсе яго неземляробскія прыбыткі — урэшце, парашыў «вывяліцца» ад с-г. падатку, з якой мэтай 26 чэрвеня г. г. падаў у сельсавет заяву, дзе ён ставіць у сьведамасьць, што з гэтага ліку спыняе вытварэньне „трэб" як у царкве, гэтак у сабе на даму і ў прыватных дамох, у зьвязку з чым настайвае пры налічэньні с-г. падатку абкласьці яго, як хлебароба, ня ўлічваючы набочных прыбыткаў.

Нам здаецца, што калі баця мяркаваў зрабіць «фурор» адмаўленьнем ад трэб (адначасова не адмаўляючыся ад „сапу")—дык ён упусьціў адну істотную драбніцу існуючага законапалажэньня, што неземляробскія заработкі пры налічэньні с-г. падатку ўлічваюцца за мінулы год, г. зн. з 1 мая 1927 г. да 1 мая 1928 г.

«Номер», выкінуты бацяй, магчыма ажыцьцявіцца толькі ў будучым годзе, але-ж пры ўмове, калі ён сапраўды адмовіцца ад „трэб".

А.

*Клімавіцкі райён.*

## Таксама „вучот"...

Вёсцы Баслаўцы Сяраднікаўскага сельсавету належыць вялікі абмер балот, якія прылягаюць да р. Лакнеі. Гэтая сенажаць заўсёды заліта вадою, парасла мохам і сена з яе выносіць на плячох. Балота—тарфяністае: 10 дзесяцін адведзена пад тарфянік, які распрацоўвае мясцовае тарфянае таварыства.

Увесь гэты абшар ад абкладаньня падаткам быў вызвалены яшчэ з 22 г. Цяпер-жа па якіясьці прычынах уся гэтая балотная сенажаць мясцовай камісіяй па вучоту аб'ектаў уведзена ў аб'екты абкладаньня.

Сялянства абурылася, але маўчала, ня ведаючы сёлетніх законаў: кампанія па растлумачэньню падатку вялася слаба.

Так мы маўчалі да атрыманьня «Беларускае Вёскі» № 68, дзе гаворыцца аб тым, што балотная сенажаць у аб'екты абкладаньня не ўваходзіць.

Выходзіць, што Слуцкі РВК сам ня ведае сёлетніх законаў па падатку і ня даў кіраўніцтва сваім сельсаветам.

Дзе вочы і вушы Слуцкага РВК?

Янка Рабіна.

*В. Баслаўцы, Случчына.*

## Здаюць с.-г. падатак

На запыраным пленуме РВК, які адбыўся 30 ліпеня з удзелам старшынь і сакратароў с.-с., апошнія вынесьлі пастанаўленьне, каб пры атрыманьні акладных лістоў, у першую чаргу заплаціць самім падатак, а таксама навесьці растлумачальную працу сярод насельніцтва аб датэрміновай здачы падатку.

Вынікам гэтага былі паступленьні падатку ў сумі 137 р. 73 к. Першымі здалі: МОРЫЧЕНКО, ВАРАНЦОЎ, БЯСЬСМЕРТНЫ, ТУРЧЫКАЎ, ДРАЗДОЎ, КАПІТОНАЎ, СЬЛІСАЎ, ЗРАНКОЎ, РАБЫЧЫН, БАРАНАЎ, БАРДОЎСКІ, ГАРНІЗОНАЎ, ДЗЯМІДАЎ, МАХОРСКІ, КАВАЛЕНКА І УСЛАЎ. Трэба браць і астатнім прыклад ад упамянёных грамадзян.

В. Р.

*Чывускі р., Магілеўшчына.*

# У ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЗЕ.

### АБ КАМІТЭЦЕ ПА БУДАЎНІЦТВУ ПРЫ ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЗЕ.

Шпаркае разьвіцьцё будаўніцтва ў БССР за апошнія гады выклікае неабходнасьць узмацнёнага рэгуляваньня яго з аднаго цэнтру. У мэтах упарадкаваньня і патаненьня будаўніцтва праз аб'яднаньне работы па рацыяналізацыі будаўніцтва Эканамічная Нарада пастанавіла ўтварыць пры ёй камітэт па будаўніцтву.

На камітэт усклада́ецца эканамічна-тэхнічнае рэгуляваньне ўсяго будаўніцтва і агульны нагляд за ім, у прыватнасьці: распрацоўка будаўнічых правіл, форм каштарысаў, тэхнічнай справаздачнасьці, распрацоўка законапраектаў у гэтай галіне, тэхнічны кантроль, устанаўленьне тыпаў масавага будаўніцтва, кантроль за будаўніцтвам, кіраўніцтва і нагляд за дзейнасьцю акруговых органаў будаўнічага кантролю і г. д.

Паколькі да камітэту пераходзяць функцыі Кіраўніцтва Рэспубліканскага Інжынэру НК Унутраных Спраў, Эканамічная Нарада падала гэты праект на зацьверджаньне СНК БССР.

СНК прызнаў мэтазгодным утварэньне камітэту па будаўніцтву і даручыў падрыхтоўчай камісіі СНК распрацаваць адпаведны праект змен у палажэньні аб НК Унутраных Спраў.

### АБ ЭКСПАРЦЕ САМАТУЖНА-МАСТАЦКІХ ВЫРАБАЎ.

У даваенны час з межаў цяперашняга СССР вывазілася заграніцу шмат саматужна-мастацкіх вырабаў. І цяпер заграніцаю наглядаецца вялікі попыт на саматужна-мастацкія вырабы Саюзу ССР. Такім чынам разьвіцьцё гэтага вырабу зьяўляецца вельмі карысным.

У БССР ёсьць поўная магчымасьць разьвіць саматужна-мастацкую прамысловасьць, напрыклад: узорныя тканіны, мастацкія вырабы з дрэва, ганчарныя вырабы, выраб саломкі і г. д. Асобныя месцы, дзе гэтая вытворчасьць разьвіта, ёсьць, але трэба яе пашырыць, і аб'яднаць у адным рэгулюючым цэнтры. З прычыны гэтага СНК, пастановай сваёй ад 28-га мая 1928 г. даручыў Белкустпрамсаюзу зрабіць захады да пашырэньня саматужна-мастацкай вытворчасьці і да экспарту гэтых вырабаў заграніцу.

Эканамічнаю Нарадаю быў заслуханы даклад Белкустпрамсаюзу пра арганізацыйныя мерапрыёмствы аб разьвіцьці саматужна-мастацкай вытворчасьці. У некаторых галінах ужо ўтвораны арцелі па гэтай вытворчасьці, арганізуюцца новыя арцелі, але наогул іх вельмі мала. Таксама ня выканана пастанова СНК аб экспарце саматужна-мастацкіх вырабаў за межы.

Таму Эканамічная Нарада прызнала, што даручэньне СНК БССР выканана незадавальняюча і даручыла Белкустпрамсаюзу ўносьці праз месяц НК Гандлю даклад аб мерапрыёмствах па разьвіцьці вытворчасьці і экспарту саматужна-мастацкіх вырабаў, пасьля чаго даклад з заключэньнем НК Гандлю павінен быць уносны на разгляд Эканамічнай Нарады.

# Праверка—самакрытыка—кантроль мас.

## БАБРУЙСКІЯ „АБАРОНЦЫ".

На старонках «Савецкай Беларусі» № 172 ад 27 ліпеня быў зьмешчаны допіс «Кулачнае выхаваньне», у якім падаваўся факт занясеньня пабоку броньвучню каўбаснае майстэрні Пікману—былым уласьнікам майстэрні Броселям. Там-жа падаваліся фактыканкурэнцыі паміж с.-саюзам, райсаюзам і Белмясгандлем, за асобу Бросеяя і яго майстэрню на працягу трох год. Яны сваёй конкурэнцыяй давялі да таго што Бросель атрымоўваў адной пэнсіі 180 руб. у м-ц, а разам за майстэрню і паслугі плаціў—400 руб. За пабоі вучня Броселя асудзілі на 1 год зьняволеньня. Ён сядзіць цяпер у папраўчым доме, але справа на гэтым ня спыняецца. За яго «асобу» ратуе Бабруйскі акрсельсаюз. Ён хоча, каб Броселя вызвалілі, бо такога «спеца», па яго думцы, не знайсьці.

— Вытворчасьць і якасьць «падае» вось грунт для працаўнікоў с-саюзу. Ім напляваць на сутнасьць справы і грамадзкае значэньне суда—«гішэфт» вышей за ўсё. Апрача гешэфту мілісьцівае хадайніцтва прыцяляў Броселя мусі-быць мае некаторае значэньне для нашых «абаронцаў». Бо як можна вытлумачыць такое зьявішча, што акрсельсаюз афіцыйна піша ад 6-7 г. г. за № 6003 Бабруйскаму акрсуду, адносіну такога зьместу: «23 чэрвеня грам. Бросель Міхаіл Вікенцьевіч выязнной сэсіяй акруговага суду, у гор. Слуцку засуджан—«заключэнію» у доп бяз суровага адмежаваньня тэрмінам на адзін год. Тав. Бросель—спец павырабу каўбас, і да дню ўзяцьця яго пад арышт працаваў у нашай слуцкай каўбаснай у якасьці старшага майстра.

З узяцьцем т. Броселя пад арышт, якасьць выраблянных каўбас пагоршылася, а цяперашні намесьнік па сваёй кваліфікацыі шмат ніжэй Броселя. Просім дазволу т. Броселю адначасова з адбыцьцем кары працаваць у нашай каўбаснай майстэрні.

Подпісы—праўленьне. Сэкратар".

Калі суд адказаў, што гэта ня справа суду, дзе Бросель будзе сядзець і працаваць, дык сельсаюзаўцы ў другі раз пішуць у папраўчы дом адносіну № 6205 і настойліва просяць «пасьпяшыць з выкананьнем і задавальненьнем першае паперы вышэй паданага зместу».

Можа і ня варта было-б пісаць, калі-б гэты выпадак ня меў грамадзкага значэньня і калі-б ён неабураў мясцовых працаўнікоў і рабочых гораду Слуцку і калі-б ня радаваў абываталяў, якія спадзяюцца, што Бросель «сваё пакажа», «ён вызваліцца».

Па самай справе якасьць каўбас ні на ёту не пагоршылася. Майстар, які ў сучасны момант працуе—добры і стабры працаўнік гэтае майстэрні. Па кваліфікацыі ён ня ніжэй Броселя. Другая справа, што Бросель яго эксплятаваў раней і што пры Броселі ён працаваў за сябе і Броселя. Майстар у сучасны момант атрымоўвае надбаўку ў 50 рублёў да свае пэнсіі і нясе поўную адказнасьць—за каўбасную. Бяз броселеўскай пэнсіі і яго незаменнасьці ўжо з'эканомлена майстэрняй у м-ц адной зарплаты 130 руб. Рабочыя задаволены, што няма «пана гаспадара», грунтоўна кажуць, што даўно пара было-б спыніць пераплату

Адкуль узялі сельсаюзаўцы, што якасьць каўбас «ухудшылась» калі ні нагою ніхто з іх ня быў у майстэрні.

Гэты факт беспадстаўнасьці хадайніцтва кажа, што працаўнікі Бабруйскага с-саюзу дзейнічалі па сваіх уласных і шкодных меркаваньнях. Яны нават ня ведаюць, які суд і каго судзіў, бо судзіў злачынцу народны суд г. Слуцку, а не акрсуд.

Гэта яскрава сьведчыць аб тым, што «абаронцы» з акрсельсаюзу забыліся дзе і каму яны патурацюць.

Райённыя арганізацыі давялі да ведама належных акруговых устаноў аб гэтым абураючым выпадку „абаронцаў. Яны палічылі сваім абавязкам давесьці таксама аб гэтым і да ведама савецкай грамадзкасьці прав друк.

Язэп.

## „Карнавал огней".

Хто з нас ня чытаў гэтага надпісу на мітавых афішах саду «Прафінтэрн»?

Што і гаварыць, рэкляма была пастаўлена проста на амэрыканскую ногу:—шмат абяцаючыя афішы былі раскіданы па ўсіх кутках нашага Менску.

Культаддзел ЦСПСБ, правільней кажучы, адміністрацыя саду пашла насустрач працоўцым, і білеты на «Карнавал огней» прадаваліся нават па ўсіх газетных кіёсках і ў вынікі...

Сад «Прафінтэрн» быў набіты, як гаворыцца, да адказу.

Кажуць, навет загадчык саду тав. Райнес паціраў ад здавальненьня рукі.

Пагледзім, што-ж атрымалі тысячы працоўных, якія сабраліся пагледзець «цуд» ініцыятывы адміністрацыі саду «Прафінтэрну».

Само «гуляньне» пачалося а 6-й гадзіне.

Толькі шчасьліўцы маглі крыху адпачыць... Ня ў поўным сэнсе гэтага слова, а пасядзець на лавах саду, а большая частка гэтых тысяч бадзялася з канца ў канец па дарожках і чакала...

А 9-й гадзіне частка з тысяч працоўных мела магчымасьць пагледзець кіно-фільм, які вельмі часта рваўся, ды наогул, відаць, складаўся з кавалкаў былога фільму.

Замест „Карнавалу огней" прышлося пабачыць звычайныя ракеты з некаторымі варыяцыямі і бэнгальскія агні. Наогул, усё гэта «удовольствие» з агнямі ў агульнай складанасьці заняло на больш 20-30 хвілін, і ніякага «Карнавалу огней» усё-ж пабачыць не ўдалося.

У афішах гледачам абяцалася выступленьне на эстрадзе артыстаў, але, замест 9-й гадзіны, каля паловы адзінаццатай артысты паказалі... як ня трэба выступаць.

Трэба сказаць, што ў гэты дзень у тэатры саду ішла аперэта «Белая моль», і вось артысты ў грыме і касьцюмах выканалі 3-4 нумары сьпеваў, якія ні розуму, ні сэрцу слухача нічога не далі... Звычайныя «запстыя» аперэтачныя песенькі...

Нават і гэтыя выступленьні мелі шчасьце бачыць толькі сотні, а чуць—дзесяткі прысутнічаўшых на „Карнавале", бо ў садзе няма ўмоў, каб абслужыць з эстрады тысячы слухачоў.

Якія-ж вынікі?

Для адміністрацыі добрыя, бо грошай сабралі шмат, а для гледача...

Глядач толькі змарыўся і незадоволны пашоў да хаты.

Культаддзелу ЦСПСБ трэба падумаць, як сад „Прафінтэрн" зрабіць сапраўдным месцам разумнага адпачынку для членаў прафсаюзаў, а ня мучыць такімі «карнаваламі».

Прысутнічаўшы.

## Альхоўскі „праводзе" пасяўную кампанію.

Магілеў, 7-8. Да старшыні Магілеўскага райённага камітэту сялянскае ўзаемадапамогі т. Альхоўскага зьвярнулася пядаўна сялянка з вёскі Чырвонапольле П. Кукушкіна з просьбаю выдаць ёй 2 пуды яўса на абсемяненьне.

Кукушкіна—удава, чалавек яе памёр яшчэ ў 1918 г., прышоўшы з фронту, пакінуўшы ёй пяцёра малых дзяцей.

Кукушкіна і сама хворая, застаіць на ўтрыманьні аддзелу сацыяльнае забясьпекі. Гаспадарка яе—дзьве дзесяціны зямлі ды адна карова.

Дык вось, у адказ на яе просьбу, т. Альхоўскі такое «изрек»:

— Я табе дапамагчы не магу... У цябе двое дзяцей на дзяржаўны кошт навучаюцца. Нечага там! Хопіць...

Значыцца—няхай пустуе тая нішчасная дзесяціна, няхай пакутуе жанчына-ўдава з дзецьмі, няхай не парушыцца на два пуды фонд райённага КСУ... Эх, таварыш Альхоўскі, таварыш Альхоўскі!

Юр.

## „Ахоўваюць" лес

Недалёка ад Барысава знаходзіцца в. Перасады. Каля гэтай вёскі красуецца вялікая плошча лесу мясцовага значэньня, якая знаходзіцца пад наглядам Перасадзкага вобчества. У гэтым вобчастве маецца два ўпаўнаважаных па нагляду за лесам і адзін лясьнік. Людзі яны здольныя, як разважаюць сяляне. За бевгаспадарчасьць можна ім выдаць добрую ўзнагароду. Каб нічога не рабіць, яны разгульвалі, палажыўшы рукі ў кішэні, і аб ахове лесу не клапаціліся.

У працягу некалькіх гадоў імі не вялося ніякага вучоту адпушчанага і падрытаванага да водпуску лесу. Два гады не рабілася ачыстка лесасек. Ня было грашовага вучоту, ні паступленьня, ні выдаткаў, з якой прычыны ўтвараўся шэраг незаконных разрахункаў і г. д. Батрак гр. Вярдбіцкага па загаду свайго гаспадара члена с. с. зьнішчаў лес ня горш за заядлых парубшчыкаў. Сяляне аднялі пілу і сякеру у «старэннага працаўніка» і здалі ўлівенскаму лясьніцтву.

Перасадзкія лясныя працаўнікі, калі адпушчалі насельніцтву лес, «абмералі яго на вока» і кляймілі дрэвы на кватэры сялян. Сялянам не выдавалася ніякіх дакумантаў, што ім адпушчан лес, і хто колькі хацеў, толькі сёк.

Уся гэта справа павінна быць высьветлена падрабязна сьледчымі органамі, а нядбайныя працаўнікі пакараны за злоўжываньні.

А. Станкевіч.

*Н. Барысаў.*

## „Маленькае" непаразуменьне.

Перада мною характэрны абежнік Менскага Акрангалля за подпісам самога тав. Гравіта. Абежнік у красамоўных выразах, катэгарычна і настойліва патрабуе выкананьня пляну па загатоўцы пяньні ў Менскай акрузе... Абежнік зьвернут да ўсіх, усіх, г. зн. да ўсіх загатоўнаў Менскай акругі, што, вось, пянька ў акрузе т. Гравіта слаба загатаўляецца, што плян выкананы усяго на 42 проц., і загадвае напоўніць упушчанае.

Усё гэта вельмі добра, т. Гравіт. Вам абавязак рэагаваць на слабую загатоўку, і калі Наркамгандаль БССР выдае такі абежнік па БССР, калі па ўсяму БССР выдаецца абежнік аб узмацненьні загатовак пянькі, дык Менскі Акрангандаль, зусім не задумваючыся, здымае копію з абежніку і пасылае яго на арганізацыях Менскай акругі, зусім забыўшы адну акалічнасьць, што ў Менскай акрузе няма пянькі... що на ўсёй акрузе можна сабраць некалькі пудоў пянькі і то не пануўна.

Мы лічым гэта „маленькім" непаразуменьнем з боку нашага паважанага Акрангандлю. Напамінаньне аб узмацненьні загатоўкі таго ці іншага тавару—рэч неабходная і вельмі карысная, але пісаць абежнікі аб рэчах, якіх нельга ажыцьцёвіць—гэта, на наш погляд, зусім непатрэбнае. Менскі Акрангандаль павінен быў ведаць, што ў Менскай акрузе пянькі няма, што ніякія красамоўныя і вялічавыя абежнікі не дапамогуць у справе загатоўкі пянькі.

Стрэлачнік.

# ПЕРАД АСЕНЬНЯЙ СЯЎБОЙ.

**Савгасы Белсельтрэсту зробяць вялікую дапамогу насельніцтву ў часе сяўбы.— Трэба павялічыць дадаткова крэдыты на набыцьцё мінэральнага ўгнаеньня. — Прасоўваньне буйных с.-г. машын у сялянскія масы.**

## Савецкія гасп. рыхтуюцца да сяўбы.

Падрыхтоўку да асеньняй сяўбы Белсельтрэст праводзіць сёлета пад лёзунгам павялічэньня ўраджайнасьці, агранамічнай, тэхнічнай, матар'яльнай дапамогі бяднейшаму насельніцтву. Белсельтрэст зьвярнуў увагу савгасаў, каб апошнія зрабілі захады да аказаньня агрыкультурнай дапамогі насельніцтву асабліва ў часе сяўбы.

Пляц азіміны ні ў якім выпадку не павінен скарачацца ў параўнаньні з тымі заданьнямі, якія былі вызначаны ў вытворчым пляне. Дзеля павялічэньня ўраджайнасьці зроблены захады да своечасовага ворыва яго пад жыта. Апошні тэрмін жытняй сяўбы павінен закончыцца ў першай палове верасьня.

Тыя 1000 тон суперфасфату, якія сёлета атрымаў Белсельтрэст на асеннюю сяўбу, былі своечасова разьмеркаваны па савгасах з такім разрахункам, каб запраўдзіць іх усю папарную зямлю. Бязумоўна, што гэта павінна падвысіць ураджайнасьць жыта. Дзеля таго, каб пашырыць пасевы сартавога жыта, Белсельтрэст атрымаў 380 цэнтн. пятнускага жыта, якое будзе высеена ў 3-й групе дзяржаўных насенных гаспадарках (Менская акруга).

Апрача падвышэньня ўраджайнасьці, Белсельтрэст зварачвае вялікую ўвагу на ашчаднае выкарыстаньне насеньня. Дзеля гэтага каля 70 проц. усяго азімага пляцу будзе праводзіцца радавой сяўбою. У тых савгасах, якія разводзяць пшаніцу-азімку, будуць пратручваць яе ад сажы, а таксама робяцца захады да адсартаваньня ўсяго насеўнага матар'ялу.

Адной з галоўных задач дапамогі насельніцтву зьяўляецца перадача з савгасаў 25 тысяч цэнтнэраў пасяўнога жыта. Гэта задача вельмі сур'ёзная: савгасы атрымалі заданьне своечасова выканаць яе, каб пасьпець перадаць насельніцтву насеньне да сяўбы. Прымаючы пад увагу тое, што савгасы будуць адразу малаціць, апошнія якраз справяцца забясьпечыць тую частку насельніцтва жытам, у якога ня будзе свайго насеньня.

Сёлета савецкія гаспадаркі значна разгарнулі працу сваіх майстэрняў, якія павінны рамантаваць інвэнтар і начыньне ваколічнага бяднейшага насельніцтва. Апроч гэтага, савгасы будуць даваць на пракат насельніцтву патрэбныя с.-г. машыны, будуць ачышчаць насеньне і г. д. Але савгасы не павінны спыняцца толькі на мерапрыёмствах аграпрапагандысцкага характару, яны павінны на практыцы на палёх сялянства прапагандаваць радавую сяўбу, каб сялянства магло пераканацца ў вялікай карысьці радавой сяўбы.

Гэтым яшчэ не абмяжоўваецца дапамога савгасаў сялянству ў часе сяўбы. Яны павінны сваімі сіламі дапамагаць абсяваць тым гаспадаркам, якія гэтага самі ня змогуць зрабіць. У гэтай рабоце савгасы і камітэты сялянскай [узаемадапамогі павінны мець поўную дагаворанасьць і сталую ўвязку. Савгасы зьяўляюцца ня толькі культурнымі с.-г. асяродкамі, але яны праводзяць значную работу па аказаньні ваколічнаму насельніцтву агранамічнай і матар'яльнай дапамогай.

## Бліжэйшыя задачы пасяўной кампаніі.

Наркамзем разаслаў на месцы дырэктывы аб своечасовай падрыхтоўцы да правядзеньня асеньняй сяўбы. Неадкладнай задачай у гэтай кампаніі зьяўляецца пашырэньне пасяўнога пляцу азіміны на 1,5 проц., але не за кошт павялічэньня самага пляцу ў суадносінах да іншых культур, а, галоўным чынам, шляхам уцягненьня ў с.-г. карыстаньне аблогаў, лясных расчорчовак і г. д.

Як вельмі важнае мерапрыёмства ў галіне стварэньня моцнага базісу сельска-гаспадарчай вытворчасьці зьяўляецца арганізацыя с.-г. калектываў. У часе асеньняй сяўбы трэба прадоўжаць арганізацыйнае і фінансавае афарміленьне гэтых асяродкаў калектыўнага будаўніцтва. Ад шпаркага ўзросту с.-г. калектываў залежыць магутны ўздым усёй нашай сельскай гаспадаркі. Вось чаму на гэту справу трэба зараз зварнуць асаблівую ўвагу.

Дзеля павялічэньня ўраджайнасьці ў часе сёлетняй асеньняй сяўбы праводзіцца цэлы шэраг агранамічных, тэхнічных і культурных мерапрыёмстваў. Частка гэтых мерапрыёмстваў зараз знаходзіцца ў стадыі падрыхтоўкі. Канкрэтна мы зараз маем наступнае: Белсельтрэст павінен перадаць сыстэмае с.-г. кааперацыі для насельніцтва 25 тысяч цэнтнэраў жыта. Апроч гэтага, 50 тысяч пуд. жыта будзе завезена да 1-га верасьня з паўночных райёнаў Украіны.

Завозіцца наступнае ўгнаеньне: суперфасфату—7800 тон і фосфарнай мукі—2200 тон. Апроч гэтага, засталося ад вясеньняй сяўбы 1603 тоны суперфасфату, 298 тон тамасшлаку 57 тон калійнай солі і 100 тон аноцістых угнаеньняў. Суперфасфат і фасфарыстыя ўгнаеньні завезены больш менш пляхава, але, прымаючы пад увагу вялікі попыт на штучнае ўгнаеньне з боку насельніцтва, гэтага ўгнаеньня будзе мала.

Наркамзем намеціў завезьці да асеньняй сяўбы 250 тон азімай вікі. Частка вікі будзе завезена з-за межаў, а частка—з Украіны. З-за межаў віка будзе завезена да 1-га верасьня, а з Украіны (1000 пудоў)—да 20-га жніўня.

Што-ж датычыцца с.-г. машын, то тут усё абстаіць добра.

Аднак, трэба зазначыць, што значнай перашкодай у надыходзячай кампаніі зьяўляюцца абмежаваныя асыгнаваньні на крэдытаваньне штучнага ўгнаеньня. У той час, калі завоз суперфасфату дадаткова павялічыўся на 2000 тон, на крэдытаваньне трэба было дадаткова асыгнаваць прынамсі ня менш, як 50 тысяч руб.

## Цэнтраземсклад перад сяўбою.

Дзякуючы існуючай шкале на продаж розных с.-г. машын, бяднэйшія пласты вёскі зараз літаральна загружаюць сваімі падводамі штодня вялікі дваязінец Цэнтраземскладу, зараз асабліва шмат купляюць малатарняў, арфаў, слячкарняў, жнярак і інш. Бываюць выпадкі, калі адну жнярку купляе 10-12 асоб. Насельніцтва ўжо пераканалася ў карысьці калектыўнага карыстаньня с.-г. машынамі, і гэта ўжо зьяўляецца тэй пупавінай, якая вядзе да арганізацыі машынных таварыстваў.

Цэнтраземсклад прадаў сёлета с.-г. машын на 50 проц. больш, чым летась і ў тры разы больш, чым па-валетась. Новымі масавымі с.-г. машынамі, на якія зараз адчуваецца вялікі попыт, зьяўляюцца жняркі і трактары. Сёлета ўжо распаўсюджаны 25 трактараў, а 4 маюць быць хутка завезены з-за межаў. Толькі 10 трактараў набылі мэліарацыйныя т-вы, рэшту купілі савгасы і калгасы.

## Ня будуюць, а грошы марнуюць.

У мястэчку Капаткевічах, як і ў іншых мясцох нашай рэспублікі, шырока распачынаецца капітальнае будаўніцтва.

Толькі добры нагляд патрэбен з боку за гэтым будаўніцтвам.

У 1928 г. будавалася пурэйская школа. Насельніцтва радавалася, гледзячы на прыгожы будынак. Калі канчалі пабудову, падвярнуўся такі майстар, які скончыў яе за дзьве гадзіны. Школа, на якую было затрачана больш як 10 тысяч руб., стала попелам.

Цяпер замест згарэўшага будынку па такім-жа пляну будуецца в дошчак новая школа. Як у ёй прыдзецца выхоўваць здаровае пакаленьне—пакажа час.

Апрача школы так-жа пабудавана двухпавярховае памяшканьне пад больніцу. У гэтым памяшканьні ніяк ня знойдзеш толку.

Печы, якія былі зроблены, праз тыдзень разваліліся. Заместа іх нашы будаўнікі пачалі рабіць новыя. Колькі лішніх грошай ідзе на такую бесталковую будоўлю?

Хворыя, якія зьмешчаны ў больніцы, вельмі чакаюць, каб хутчэй адбудавалася новае памяшканьне, бо ў старым скарэй можна памерці, чым папраўіцца.

Старое памяшканьне больніцы амаль кожны дзень пачынае гарэць і толькі дзякуючы добрай пажарнай дружыне ўдаецца яго абараняць. Дружына знаходзіцца ня вусім у добрым становішчы. РВК коняй на пажар не дае, а ў дружыны сваіх не хапае.

Ці не патрэбна было-б ад вышэйшых устаноў даць якую-небудзь узнагароду капаткевіцкім «будаўнікам»?

Вожык.

## Вось дык парадачак!

Ці на чубатую долю, ці на вялікае шчасьце працаўнікоў Дубровенскай пошты ў горадзе ўсплыла нейкая красуля Рахіль Баеўская, якая сваім зьяўленьнем ускалыхнула ўсю паштовую братву.

Роўна ў гадзіну прыбыцьця пошты Баеўская ўжо на пошце: паштавікі дазваляюць Баеўскай праглядаць усе лісты, якія атрымлівае пошта.

Пашто гэта прыяцелям, або прыяцелькам Баеўскай, прыходзячым з вёскі, чакаць лістаносцаў два разы ў тыдзень, калі праз Баеўскую ўсё можна зрабіць. Можна атрымаць заказны ліст і ўсё іншае.

А ці-ж толькі вінавата Рахіль?

Калі прыглядзецца з боку, дык убачыш, што шмат людзей, ня маючых адносін да пошты, заходзяць у габінеты працаўнікоў і бяруць з пошты, што пажадаюць. Тут поўная пашана аўтарытэту ня толькі працаўнікоў РВК, але і прыватных асоб.

Разам з гэтым трэба закрануць і агульнае становішча пошты. Раней, калі загадчыкам пошты быў т. Міхееў, пошта мела выгляд ня толькі дзяржаўнай установы, але зьяўлялася палітасьветным і грамадзкім асяродкам. Цяпер і дзесятай часткі праробленай Міхеевым працы не засталося. Пеня напрыемна выглядае пошта...

Э. С.

# ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

## Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне ўвагаю артыкулу 32 „правіл правядзеньня арышту і продажу з публічных таргоў маемасьці за ня плату падаткаў".

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе дадаць да артыкулу 32 «правіл правядзеньня арышту і продажу з публічных таргоў маемасьці за ня плату падаткаў» (З. З. БССР 1926 г., № 49, арт. 183) наступную ўвагу:

«Увага. Калі будынкі альбо права забудоўкі не праданы з таргоў і не рэалізаваны гаспадарчым спосабам на працягу двох месяцаў пасьля таргоў, то фінансавы аддел акруговага выканаўчага камітэту перадае іх па акту мясцоваму камунальнаму органу, які па згодзе з фінансавым аддзелам выплачвае яму каштоўнасьць будынку альбо права забудоўкі. Спрэчкі пра разьмер каштоўнасьці, якія ўзьнікаюць паміж камунальным органам і фінансавым аддзелам, вырашаюцца акруговым выканаўчым камітэтам».

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. Мароз.

22 ліпеня, 1928 г. г. Менск.

## Постановление Совета Народных Комиссаров БССР

о дополнении примечанием статьи 32 «правил производства ареста и продажи с публичных торгов имущества за неплатеж налогов».

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет дополнить статью 32 „правил производства ареста и продажи с публичных торгов имущества за неплатеж налогов" (С. З. БССР 1926 г. № 49, ст. 183) следующим примечанием:

«Примечание: Если строения или право застройки не проданы с торгов и не реализованы хозяйственным способом в течение двух месяцев после торгов, то финансовый отдел окружного исполнительного комитета передает их по акту местному коммунальному органу, который по соглашению с финансовым отделом выплачивает ему стоимость строения или права застройки. Споры о размере стоимости, возникающие между коммунальным органом и финансовым отделом, разрешаются окружным исполнительным комитетом».

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. Карклин.

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР М. Мороз.

22 июля, 1928 г г. Минск.

## ПАЛАЖЭНЬНЕ аб канцэсійным камітэце пры Савеце Нар. Камісараў БССР.

На падставе пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР за 14 сьнежня 1927 году „Аб канцэсійных камітэтах пры саветах народных камісараў саюзных рэспублік" (З.З. СССР 1927 г., № 69, арт. 695) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Арганізаваць пры Савеце Народных Камісараў БССР Канцэсійны Камітэт у складзе старшыні і 6 членаў, з якіх адзін выўляецца намесьнікам старшыні. Старшыня і члены камітэту пэрсанальна назначаюцца Саветам Народных Камісараў БССР. Назначэньне старшыні ўзгадняецца з Галоўным Канцэсійным Камітэтам пры Савеце Народных Камісараў СССР.

2. Канцэсійны Камітэт пры Савеце Народных Камісараў БССР беспасрэдна падпарадкаван Савету Народных Камісараў БССР і ў сваёй дзейнасьці кіруецца дырэктывамі і інструкцыямі Галоўнага Канцэсійнага Камітэту пры Савеце Народных Камісараў СССР.

3. Канцэсійны Камітэт пры Савеце Народных Камісараў БССР:

а) устанаўляе аб'екты канцэсій рэспубліканскага і мясцовага значэньня на тэрыторыі БССР, кіруе працаю па высьвятленьні гэтых аб'ектаў гарадзкім саветамі, акруговымі выканаўчымі камітэтамі і народнымі камісарыятамі БССР і распрацоўвае плян і ўмовы здачы ў канцэсію паказаных аб'ектаў;

б) распрацоўвае праекты дагавораў на канцэсіі рэспубліканскага і мясцовага значэньня;

в) вядзе перагаворы пра заключэньне канцэсійных дагавораў з асобамі, якія жадаюць узяць у канцэсію аб'екты мясцовага альбо рэспубліканскага значэньня, і, па даручэньні Галоўнага Канцэсійнага Камітэту пры Савеце Народных Камісараў СССР з асобамі, якія жадаюць узяць у канцэсію аб'екты агульнасаюзнага значэньня на тэрыторыі БССР, а таксама вядзе перагаворы пра зьмену канцэсійных дагавораў;

г) разглядае ўсе пытаньні, зьвязаныя з паказанымі ў пункце «б» дагаворамі, і падае свае заключэньні Галоўнаму Канцэсійнаму Камітэту пры Савеце НародныхКамісараў СССР;

д) разглядае з удзелам Народнага Камісарыяту Гандлю БССР праекты статутаў мяшаных акцыйных таварыстваў, калі разам з чужаземным капіталам ва ўтварэньні такіх таварыстваў удзельнічае капітал дзяржаўных устаноў ці прадпрыемстваў БССР, а таксама хадайніцтвы чужаземных фірм аб дазволе весьці апэрацыі на тэрыторыі БССР і падае гэтыя статуты і хадайніцтвы разам са сваімі заключэньнямі Галоўнаму Канцэсійнаму Камітэту пры Савеце Народных Камісараў СССР;

е) дае Галоўнаму Канцэсійнаму Камітэту пры Савеце Народных Камісараў СССР заключэньні па пытаньнях, зьвязаных з канцэсійнымі аб'ектамі агульнасаюзнага значэньня, якія цалкам альбо часткаю знаходзяцца на тэрыторыі БССР;

ж) кіруе перагаворамі акруговых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў аб задачы ў канцэсію камунальных прадпрыемстваў;

з) робіць захады да зьнішчэньня перашкод ажыцьцяўленьню канцэсійных дагавораў;

і) наглядае за канцэсіямі рэспубліканскага і мясцовага значэньня і кантралюе правядзеньне органамі БССР даручанага ім нагляду за канцэсіямі;

к) у патрэбных выпадках хадайнічае перад Галоўным Канцэсійным Камітэтам пры Савеце Народных Камісараў СССР аб скасаваньні дагавораў на канцэсіі рэспубліканскага і мясцовага значэньня;

л) выконвае даручэньні Галоўнага Канцэсійнага Камітэту пры Савеце Народных Камісараў СССР;

м) дае Галоўнаму Канцэсійнаму Камітэту пры Савеце Народных Камісараў СССР справаздачы аб становішчы канцэсійнае справы ў БССР і аб дзейнасьці Канцэсійнага Камітэту пры Савеце Народных Камісараў БССР.

4. Пастановы Канцэсійнага Камітэту пры Савеце Народных Камісараў БССР па пытаньнях, паказаных у пунктах «а», «е» і «з» артыкулу 3 гэтага палажэньня, пасылаюцца ў Галоўны Канцэсійны Камітэт пры Савеце Народных Камісараў СССР пасьля зацьверджаньня іх Саветам Народных Камісараў БССР.

5. Канцэсійны Камітэт пры Савеце Народных Камісараў БССР неадкладна паведамляе Галоўны Канцэсійны Камітэт пры Савеце Народных Камісараў СССР аб атрыманых ім канцэсійных прапановах і пасылае яму пратаколы сваіх пасяджэньняў.

6. Канцэсійны Камітэт пры Савеце Народных Камісараў БССР па ўсіх пытаньнях, якія належаць да яго кампетэнцыі, зносіцца з усімі дзяржаўнымі ўстановамі ў парадку, устаноўленым для народных камісарыятаў саюзных рэспублік, а з канцэсійнымі камісіямі пры гандлёвых прадстаўніцтвах Саюзу ССР за межамі—беспасрэдна.

7. Канцэсійны Камітэт пры Савеце Народных Камісараў БССР мае права патрабаваць ад усіх ведамстваў і ўстаноў патрэбных яму зьвестак, зьвязаных з канцэсійнаю справаю.

8. Пры народных камісарыятах, пры акруговых выканаўчых камітэтах і пры гарадзкіх саветах БССР на падставе адпаведных пастаноў Канцэсійнага Камітэту пры Савеце Народных Камісараў БССР могуць арганізоўвацца канцэсійныя камісіі, кампэтэнцыя якіх вызначаецца Канцэсійным Камітэтам пры Савеце Народных Камісараў БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. Мароз.

19 ліпеня, 1928 году. г. Менск.

## ПОЛОЖЕНИЕ О концессионном комитете при Совете Нар. Комиссаров БССР.

На основании постановления Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 14 декабря 1927 года «о концессионных комитетах при Советах Народных Комиссаров Союзных республик» (С. З. СССР 1927 г., № 69, ст. 695) Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Организовать при Совете Народных Комиссаров БССР Концессионный Комитет в составе председателя и 6 членов, из которых один является заместителем председателя. Председатель и члены комитета персонально назначаются Советом Народных Комиссаров БССР. Назначение председателя согласовывается с главным Концессионным Комитетом при Совете Народных Комиссаров СССР.

2. Концессионный Комитет при Совете Народных Комиссаров БССР непосредственно подчинен Совету Народных Комиссаров БССР и в своей деятельности руководствуется директивами и инструкциями Главного КонцессионногоКомитета при Совете Народных Комиссаров СССР.

3. Концессионный комитет при Совете Народных Комиссаров БССР:

а) устанавливает об'екты концессий республиканского и местного значения на территории БССР, руководит работой по выяснению этих об'ектов городскими советами, окружными исполнительными комитетами и народными комиссариатами БССР и разрабатывает планы и условия сдачи в концессию указанных об'ектов;

б) разрабатывает проекты договоров на концессии республиканского и местного значения.

в) ведет переговоры о заключении концессионных договоров с лицами, желающими взять в концессию об'екты местного или республиканского значения, и, по поручению Главного Концессионного Комитета при Совете Народных Комиссаров СССР, с лицами, желающими взять в концессию об'екты общесоюзного значения на территории БССР, а также ведет переговоры об изменении концессионных договоров;

г) рассматривает все вопросы, связанные с указанными в пункте «б» договорами, и представляет свои заключения Главному Концессионному Комитету при Совете Народных Комиссаров СССР;

д) рассматривает с участием Народного Комиссариата Торговли БССР проекты уставов смешанных акционерных обществ, если наряду с иностранным капиталом в образовании таких обществ участвует капитал государственных учреждений или предприятий БССР, а также ходатайства иностранных фирм о разрешении производить операции на территории БССР и представляет эти уставы и ходатайства вместе со своими заключениями Главному Концессионному Комитету при Совете Народных Комиссаров СССР;

е) дает Главному Концессионному Комитету при Совете Народных Комиссаров СССР заключения по вопросам, связанным с концессионными об'ектами общесоюзного значения, целиком или частично находящимися на территории БССР;

ж) руководит переговорами окружных исполнительных комитетов и городских советов о сдаче в концессию коммунальных предприятий;

з) принимает меры к устранению препятствий для осуществления концессионных договоров;

и) наблюдает за концессиями республиканского и местного значения и контролирует проведение органами БССР порученного им надзора за концессиями;

к) в необходимых случаях ходатайствует перед Главным Концессионным Комитетом при Совете Народных Комиссаров СССР о расторжении договоров на концессии республиканского и местного значения;

л) исполняет поручения Главного Концессионного Комитета при Совете Народных Комиссаров СССР;

м) дает Главному Концессионному Комитету при Совете Народных Комиссаров СССР отчеты о положении концессионного дела в БССР и о деятельности концессионного комитета при Совете Народных Комиссаров БССР.

4. Постановления Концессионного Комитета при Совете Народных Комиссаров БССР по вопросам, указанным в пунктах „а", „е" и «з» статьи 3 настоящего положения, посылаются в Главный Концессионный Комитет при Совете Народных Комиссаров СССР после утверждения их Советом Народных Комиссаров БССР.

5. Концессионный Комитет при Совете Народных Комиссаров БССР немедленно извещает Главный Концессионный Комитет при Совете Народных Комиссаров СССР о полученных им концессионных предложениях и посылает ему протоколы своих заседаний.

6. Концессионный Комитет при Совете Народных Комиссаров БССР по всем вопросам, относящимся к его компетенции, сносится со всеми государственными учреждениями в порядке, установленном для народных комиссариатов союзных республик, а с концессионными комиссиями при торговых представительствах Союза ССР за-границей—непосредственно.

7. Концессионный Комитет при Совете Народных Комиссаров БССР имеет право требовать от всех ведомств и учреждений необходимых ему сведений, связанных с концессионным делом.

8. При народных комиссариатах, окружных исполнительных комитетах и городских советах БССР на основании соответствующих постановлений Концессионного Комитета при Совете Народных Комиссаров БССР могут организовываться концессионные комиссии, компетенция которых определяется Концессионным Комитетом при Совете Народных Комиссаров БССР.

Председатель СНК БССР М. Голодед.
Управ. Дел. СНК и ЭС БССР М. Мороз.
19 июля, 1928 г., г. Минск.

Галоўлітбед 302.

# ХРОНІКА.

## Праезд швэйцарскай спартыўнай дэлегацыі.

*Учора праз Менск праехала швэйцарская рабочая спартыўная дэлегацыя ў складзе 51 чалавека. Дэлегацыя накіроўваецца ў Маскву на ўсесаюзную спартакіяду. Для спатканьня дэлегацыі з Масквы прыяжджаў член арганізацыйнага камітэту спартакіяды т. Цэйтлін. Вышэйшы і Акруговы Савет Фізкулькуры наладзілі замежным дэлегатам урачыстае спатканьне.*

## Сасноўскі санаторы адчыніцца ў кастрычніку.

На месца пабудовы санаторыя ў Сасноўцы (Віцебшчына) выяжджаў Інжынэр Галоўсапотраху т. Сальмановіч, які ў гутарцы з нашым супрацоўнікам адзначыў, што ўжо скончана пабудова 2-х павільёнаў на 150 чалавек. Скончана таксама пабудова інтэрнату для служачых на 40 чалавек. Пабудаваны ўжо кухня, пральня, хлебапякарня і электрастанцыя. Зараз вядуцца работы па прывядзеньню ў культурны від пляжу санаторыя, разьбіваюцца дарожкі, клюмбы і інш.

Толькі што зданы «Водаканалу» работы па пракладзе каналізацыі, якая будзе гатова ў пачатку кастрычніка бягучага году.

Ужо закуплена на мясцовым заводзе «Дрэваапрацоўчнік» на 16.000 руб. мэблі. Закуплена таксама і іншае абсталяваньне, якое часткова ўжо атрымана і прыбывае ў Сасноўку.

Будаўнічыя работы затрымоўваюцца з-за адсутнасьці неабходных матэрыялаў, але ва ўсякім выпадку санаторы «Сасноўка» павінен быць адчынен у пачатку кастрычніка гэтага году.

На скончэньне пабудовы санаторыя і усіх вызначаных па плану будынкаў неабходна яшчэ 400.000 руб. Да гэтуль на пабудову санаторыя ўжо затрачана 800.000 руб., такім чынам, усё будаўніцтва будзе каштаваць 1.200 тысяч рублёў.

## Вечары і сходы, прысьвечаныя 25-годзьдзю II зьезду партыі.

Зараз па прадпрыёмствах і ў установах адбываюцца сходы, прысьвечаныя 25-ці годзьдзю II зьезду партыі.

У некаторых садох ужо адбыліся вечары, прысьвечаныя гэтаму юбілею.

## Удзел БССР у сусьветным кангрэсе гісторыкаў.

У другой палове жніўня ў Осло (Нарвэгія) распачынаецца сусьветны кангрэс гісторыкаў. Ад БССР на гэты кангрэс дэлегуюцца—праф. Ігнатоўскі і праф. Пічэта.

## Прыём заяў у БДУ скончыўся.

Скончыўся прыём заяў на факультэтах БДУ. Усяго пададзена на факультэт права і гаспадаркі на 140 месц 320 заяў; На першы курс пэдфаку на 90 месц пададзена 348 заяў і на другі курс на 100 месц—223 заявы.

Сёньня, 8-га жніўня, паступаючым будзе абвешчана, хто не дапушчан да іспытаў.

## Практыкавальна-вопытныя школы пры пэдтэхнікумах.

Нар. Кам. Асьветы БССР пастанавіў адчыніць з 1928-29 навучальнага году пры пэдтэхнікумах толькі 4-х гадовыя вопытна-практыкавальныя школы.

Апроч таго, даручана навукова-мэтадалёгічнаму камітэту вывучыць у працягу 1928-29 навучальнага году пытаньне аб рэарганізацыі 7-хгадовых вопытна-практыкавальных школ пры пэдтэхнікумах у 4-х гадовыя.

Нар. Кам. Асьветы таксама пастанавіў зьнізіць норму нагрузкі ў вопытна-практыкавальных школах пры пэдтэхнікумах, намеціўшы лік вучняў на групу для беларускіх школ з 40 да 35 і для школ нацменшасьцяў з 35 да 30 вучняў.

## Праца па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Цэнтральны Савет т-ва «Прэч няпісьменнасьць" распрацоўвае кантрольныя лічбы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці на 1928-29 навучальны год.

Згодна гэтага плану, у будучым годзе павінны быць навучаны ў лікпунктах і груп. для малапісьменных—25.277 чал. і ў школах і гурткох для малапісьменных—1.843 чалавекі.

## Пашырэньне сеткі хат-чыталеньняў.

На 1928-29 год Нар. Кам. Асьветы, згодна 5 цігадовага пляну, распачне пабудову 16 хат-чыталеньняў.

Па пляну мяркуецца будаваць на 2 хаты-чытальні ў кожнай акрузе.

## Падрыхтоўка да месячніка „За грамату".

Цэнтральны Савет т-ва «Прэч няпісьменнасьць" распачаў падрыхтоўку да месячніка «За Грамату», які будзе праводзіцца 1-га верасьня.

Ужо распрацаваны матар'ялы для дакладчыкаў, якія ў кожным часе будуць разасланы ўсім акруговым саветам т-ва «Прэч няпісьменнасьць». Таксама ЦС т-ва «Прэч няпісьменнасьць», сумесна з Нар. Кам. Асьветы, выдадзены да месячніка 3 агітацыйныя плякаты, якія будуць распаўсюджаны па хатах-чытальнях, навучальных установах і лікпунктах.

## На барацьбу з алкагалізмам.

Рабочыя шклянога заводу „Новки" пастанавілі забараніць гандаль сьпіртавымі напіткамі ў рабочых пасёлках. Цэнтральнае праўленьне саюзу хімікаў зацьверджае гэту пастанову.

## Усесаюзныя спаборніцтвы лёт ніцкіх мадэляў.

Гомельская арганізацыя ТДА-Авіяхіму пасылае мадэлісты для ўдзелу ў 3-х Усесаюзных спаборніцтвах лётніцкіх мадэляў. Гэтыя спаборніцтвы адбудуцца ў Маскве і працягнуцца з 5-га па 15-га жніўня.

## Партыя гатункавай скаціны з-за межаў.

Гэтымі днямі Белсельтрэст атрымлівае з-за межаў 50 галоў буйнай рагатай скаціны чырвонага гатунку. Скаціна закуплена ў Даніі і будзе вымешчана ў племянным гадавальніку Белсельтрэсту.

## Да арганізацыі ў Менску палепшанай сталоўкі.

Белрабсаюзныя выдае Менскаму Цэрабкопу пазыку ў 7000 руб. на адчыненьне ў бліжэйшым часе ў Менску сталоўкі палепшанага тыпу. Цэрабкоп ужо прыступіў да падрыхтоўчай працы па адчыненьню гэтай сталоўкі.

## Саматужнік і арцель.

Цяга менскіх саматужнікаў у працоўныя арцелі, якая пачалася ўжо 2 гады таму назад, не паслабляецца і ў сучасны момант.

У пачатку мая, у Менску (Ленінская, 16) адчынілася новая арцель гандзіншчыкаў і штамп'істаў пад назвай «Новы Шлях». Галоўная праца арцелі цяпер складаецца з рамонту і заводкі гадзіньнікаў як для прыватных асоб, так і для буйных устаноў, якія адчуваюць патрэбу ў пэрыядычным заводзе гадзіньнікаў і кантролі над імі.

Праводзіцца таксама і штампавая праца. Замест таго, каб зайсьці да прыватніка і пераплаціць, публіка ахвотна давярае арцелі, якая працуе больш рацыянальна і таньней. На прыбыцьці в-за граніцы (па заказу Белкустпрому) розных дапаможных частак да гадзіньнікаў, арцель спадзяецца пашырыць на адпаведную вышыню масавую выпрацоўку сьцянных гадзіньнікаў і будзільнікаў па даступнай цане.

Некалькі месяцаў назад у Менску адчынілася новая арцель для выпрацоўкі бочак—арцель бандароў спецыялістаў. У першыя-ж дні арцель атрымала заказы ад Белдзяржгандлю і заводу «Красная Заря».

Заработная плата ў арцелі вядзецца паштучна. Пры пашырэньні вытворчасьці ў арцель будзе ўцягнута некалькі сталяроў, а таксама вучняў. Такія-ж арцелі ўзнікаюць цяпер у Магілеве і Гомелі. Недалёка ад Менску існуе сялянская арцель «Селянін» для выпрацоўкі бочак.

Кажучы аб станоўчых бакох у дзейнасьці працоўных арцеляў, нельга абмінуць і адмоўных бакоў у іх працы. Швэйныя арцелі, узьнікшыя ў Менску год таму назад і ўцягнуўшыя ў сваю арбіту сотні краўцоў, у сучасны момант перажываюць сур'ёзны крызіс. Няма сыравіны, няма тэкстылю. У маі, чэрвэні і ліпені месяцах швэйнікі працавалі па 2 дні ў тыдзень, а то і менш. „Белкустпромсаюз" і „Савет Народнае Гаспадаркі" павінны працоўныя арцелі швэйнікаў уключыць у свой плян па дастаўцы сыравіны, і тады яны будзе пераборыў у іх працы.

С. Э.

## Менскі дзень.

97 чал. нарадзілася і 135 чал. памёрла за ліпень м-ц у Менску. За гэты-ж час адбылося 134 шлюбы і 49 разводаў.

7 мэліярацыйных, 14 сельсна-гаспадарчых, 19 машынных і 13 тарфяных таварыстваў арганізавана ў працягу апошняга году сельскімі камітэтамі ўзаемадапамогі ў Менскай акрузе.

Ідзе ўзмацнёная падрыхтоўка да будаўніцтва трамваю. З складаў камгасу ўжо вывезены трамвайныя рэйкі і пакладзены эд вакзалу МББ па Савецкай вул.

29.230 руб. адпушчана на мэліярацыю і торфараспрацоўкі ў савецкіх гаспадарках Белсельтрэсту. Сродкі адпусьціў Белсельбанк.

У сувязі з зачыненьнем цэнтральных курсаў грамадзнаўства, памяшканьне апошніх прадаецца пад інтэрнаты музтэхнікуму і палітэхнікуму.

З 636278 руб. будзе складацца фонд ільгот па акладному страхаваньню для аслабаненьня бедноты, сямей чырвонаармейцаў і был. партызан. Гэта сума ўжо разьмеркавана Дзяржстрахам па акругах.

У прыймовыя камісіі БДУ ад Наркамасьветы вызначаны—на пэдфак т. Шастакоў, на мэдфак—Мацюкевіч і на правгас—т. Салоў.

## Звыш 1.000 сялян прайшло праз Ц. Дом Селяніна.

За ліпень месяц праз абшчажыцьцё Цэнтральнага Дому Селяніна прайшло звыш 1.000 сялян-хадакоў. Большасьць з іх—удзельнікі сялянскіх экскурсій.

## За скажэньне нацпалітыкі.

На апошнім пасяджэньні Менскай акруговай Нацкамісіі пастаўлена на від. час. вык. аб. начальніка АДАДПУ ст. Менск Заходніх чыгунак т. Плеіну за скажэньне нацпалітыкі. З станцыі Жлобін у Менск быў накіраваны пратакол на яўрэйскай мове, а т. Плеін яго зьвярнуў назад ў Жлобін для перакладу на расейскую мову.

## Пашырэньне больніцы МББ.

Прэзыдыум гарсавету зацьвердзіў пастанову сэкцыі аховы здароўя аб пашырэньні больніцы МББ да 100 ложак. При гэтай больніцы будзе таксама адчынены габінет па скурана-венэрычных хваробах.

## На грамадзкіх работах.

Водпуг даных Наркампрацы, да 1 жніўня ў БССР скарыстана 286000 чалавекадзён, а на пляну да канца гаспадарчага году павінна быць усяго 508000 чалавекадзён Асабліва затрымаліся грамадзкія работы па Менскай акрузе, дзе з 154000 чалавекадзён скарыстана толькі пакуль-што 74.000. Досыць добра разгорнуты грамадзкія работы ў Магілеве, Віцебску і Гомелі. У апошнія дні грамадзкія работы разгарнуліся нармальна па ўсіх акругах і штодзень па іх занята 4200 чалавек беспрацоўных. Мяркуецца, што к канцу году плян грамадзкіх работ будзе выкананы поўнасьцю.

## Дэлегацыя на с.-г. выстаўку ў Кёнігзбергу.

На с.-г. выстаўку-аукцыён у Кёнігзберг (Нямеччына) гэтымі днямі выяжджаюць ад Наркамзему т. т. А. Адамовіч, Шычко і Рашотнікаў.

## Суд. Бандыт Гайдук.

13 сьнежня 1927 г. увечары сяляне вёскі Зялёнкі, Чарнеўшчынскага сельсавету, Барысаўскага раёну, Робэрт Ключнік, Іван Ермашкевіч і Ганна Залёўская вярталіся з гор. Барысава дамоў. Мароз паліў агнём. На вазох у мяшкох ляжалі розныя пакункі-рэчы. Робэрт Ключнік, каб ня сумавалі яго падарожнікі, расказваў розныя здараньні ў яго жыцьці; асабліва ён спыніўся на жахлівай ночы ў часе адступленьня беларапаляку з г. Барысава.

Не пасьпеў Ключнік скончыць свой расказ, як насустрач падкацілася фурманка, на якой былі тры ўзброеныя бандыты.

— Стой! рукі ўверх, давайце грошы і рэчы.

Перапалоханыя Ключнік, Залёўская і Ермашкевіч прынялі коні і са страху нічога не маглі сказаць. Бандыт наставіў абрэз Ключніку проста ў твар.

— Браткі, забярэце каня, толькі не забівайце мяне, не сіраціце дзяцей,—папрасіўся Ключнік.

— Здохні ты разам з канём!—крыкнуў бандыт Сяргей Гайдук,—даёш грошы!

Абабраўшы вазы і кішэні праежджых, бандыты завралі ў Ключніка 50 руб., зьнялі кажух і фрэнч; а калі Ключнік кінуўся ўцякаць, бандыт выстраліў у Ключніка, але куля прайшла міма. У Ганны Залёўскай бандыты таксама зьнялі кажух, адабралі некалькі рублёў і пачалі вязаць рукі Ермашкевічу, а калі апошні супраціўляўся, зьбілі і парэзалі яго нажамі. Нанёсшы цялесныя пашкоджаньні Ермашкевічу, бандыты зьніклі ў лесе.

На гэтым рабунку быў затрыманы і апазнаны Сяргей Гайдук; двое другіх бандытаў сьледствам і судом ня выяўлены. Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў гор. Барысаве прыгаварыла Сяргея Сьцяпанава Гайдука на шэсьць год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на тры гады. Апроч таго, суд прысудзіў з Гайдука на карысьць Ключніка 95 руб.

Кастроў.

# КУТОК РАБСЕЛЬКОРА.

## Ужо час прачнуцца.

Яшчэ з пачатку 1927 году існуе ў нас пры нардоме сельскараўскі гурток. Гэтым гуртком выпускаецца насьценгазэта «Новы шлях». У працы гуртка з пачатку яго існаваньня ніякіх хіб ня было. Але за апошні час гурток заснуў. Селькоры адчуваюць, што яны маюць на сабе абавязак напісаць у сваю газэту які-небудзь артыкул. Праўда, бываюць такія выпадкі, калі вырашаецца аб'ява, што будуць заняткі гуртка, але з сельскораў ніхто і не зьяўляецца. Дзякуючы такой слабой працы спынілася выпуск газэты. Насельніцтва гэту газэту патрабуе, каб яна выпускалася своечасова. І гуртку ў такі момант ня трэба спаць. Ужо даўно час прасынуцца і ўзяцца за працу.

Селькор.

М-ка Старобін, Бабруйшчына.

## Рабкор--сябар растратчыка.

Аб тым, што Зарэцар ходзіць па ўстановах і хваліцца, што ён рабкор, добра вядома кожнаму, а ці ён сапраўды лічыцца рабкорам—невядома нікому. Сваімі здольнасьцямі ён хваліцца ўсім. Але ўсім і асабліва працаўнікам ЦРК вядома, што Зарэцар прыносіць і паказвае свае «ліпавыя» артыкулы, якія пісаны не яго рукой. Гэты рабкор вядзе хлусьню супроць намесьніка старшыні ЦРК Рэмізава.

У адзін добры час Зарэцар зьявіўся ў кіраўніцтва ЦРК, дастаў з кішэні напісаны супроць Рэмізава артыкул і даў чытаць працаўнікам.

Працаўнікі, якія чыталі гэты артыкул, зарэ-жа ўлічылі, што ён хлусьліва напісан і не самім «ганаровым» рабкорам, а яго „памоцнікам" Бэрштэйнам.

Бэрштэйн—здольны чалавек, які раней служыў загадчыкам у булачнай, дзе растраціў шмат дзяржаўных грошай. За гэта ён атрымаў добрую ўзнагароду, але па амністыі з пад варты дачасова быў вызвалены.

Карыстаючыся тым становішчам, што Зарэцар сам мала пісьменны, Бэрштэйн дапамагае яму весьці розную хлусьню супроць Рэмізава, які выкрыў усе злачынствы Бэрштэйна.

Зарэцар мае ў сябе яшчэ аднаго памоцніка,—гэта справавод Барысаўскага гарсавету Гушчыненага, які дапамагае яму складаць допісы.

Трэба сказаць, калі Зарэцар сапраўды лічыцца рабкорам, дык такіх рабкораў трэба гвалц брудным мятлой, каб яны ня былі шыльдай для розных злачынцаў-растратчыкаў.

Корнуш.

г. Нова-Барысаў.

## Яшчэ раз аб б. „селькорцы" Сьвірноўскай.

«Ты яе ў дзьверы, а яна ў вакно».
(З нар. прыказкі).

Справа з «селькоркай» Сьвірноўскай Цыраю вельмі зацікавіла ўсю грамадзкасьць Самахвалаўскага райёну. Аб гэтай „селькорцы" ўжо паведамлялася аднойчы, як яна абараняла пад шыльдаю селькора кулацкія інтарэсы свайго бацькі-карчмара («С. Б.» № 135 ад 14-VI—г. г.). Сьвірноўскую выключылі з шэрагаў селькораў і камсамолу за яе «актыўную» дзейнасьць. Справа аднак на гэтым не застанавілася.

У г. Менску, дзе жыве швагер Сьвірноўскай, яна захацела зрабіцца «пралетаркай», замест селькорства, у якім ёй не пашанцавала. Пагэтаму Сьвірноўская заключыла з сваім шваграм дагавор і ў якасьці „хатняй" работніцы прайшла ў прафсаюз. Хітра і добра зроблена, бо вельмі хітрая гэта «сава». У яе бацькоў маецца карчма, добрая гасьцінная дзе часам бывае і гандляць гарэлкай. Але, калі міліцыя за гарэлку распачала судовую справу, дык яна яшчэ да пачатку суда ведала, хто будзе нарасьцадацелем і добра іх напаіла. Суд прайшоў без належных вынікаў.

Нарасьцадацелем быў... дзяк з Кайкаўскай парквы, які згодна пастановы прэзыдыуму Кайкаўскага сельсавету ад 17 студзеня 1927 г. пазбаўлен выбарчых правоў, адзак, чаму ён абабраны нарасьцадацелем, дык гэта—сакрэт.

Гэты „сьвяты" ведаў, што «чарка» будзе яму за паслугу ад Сьвірноўскіх. Надома, што ён за іх і клапаціўся.

Належныя ўстановы, як РВК і райком КП(б)Б ведаюць, што гэты «нарасьцадацель» пазбаўлен правоў, але чаму яны маўчаць—невядома.

Чэй-Сю.

# ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

## На ўсесаюзную спартакіяду.

### ВЭЛЁСЫПЭДНЫ ЗЬВЁЗДНЫ ПРАБЕГ МЕНСК—МАСКВА.

У суботу, 4-га жніўня, на пляцу Волі быў даны старт 7 вэлёсыпедыстам, якія на кіроўваюцца ў Маскву на адчыненьне усесаюзнай спартакіяды.

Усе 7 вэлёсыпедыстаў—рабочыя Менскіх фабрык і заводаў.

Вэлёсыпедысты павінны праехаць адлегласьць Менск—Масква у 6 в пал. дзён.

Ужо атрыманы з дарогі весткі, што на дворэ спрыяе, і вэлёсыпедысты адчуваюць сябе ў дарозе добра.

### АД'ЕЗД БЕЛАРУСКІХ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ НА СПАРТАКІЯДУ.

Сёньня а 12 гадзіне выяжджае на ўсесаюзную спартакіяду ў Маскву каманда Менскага ўлікаўчага ліга-атлетаў, футбалістаў, баскетбалістаў, вэлёсыпедыстаў, пляжа-атлетаў, тэнісыстаў і гарадошнікаў.

Сёньня-ж выяжджаюць удзельнікі беларускай каманды з Гомелю, Полацку, Віцебску і Бабруйску.

Уся каманда складаецца з 160 чалавек.

## ШАШКІ № 13.

### Пад рэд. А. Каспэрскага

Эцюд Фэльдмана. Менск.

Друкуецца 1-ы раз



Бел. D. c5 nn f2 і g3 (3)
Чорныя nn.c3 і h4 (2).

Белыя пачынаюць і выігрываюць.

Партыя грана ў менскім чэмпіянаце 1928 г.

Бел. В. Каспэрскі. Чорн. Вакштэйн

1. c3-d4 f6-g5, 2. g3-f4 d6-c5, 3. b2-c3 g7-f6, 4. c3-b4 b6-a5, 5. d4:b6 a5:c3, 6. d2:b4 c7:c3, 7. c1-b2 e7-d6 8. b2:d4 d4-c5, 9. d4:b6 a7:c5, 10. a1-b2 f8-e7, 11. b2-c3 g7-h6, 12. c1-d2 f6-g5, 13. c3-d4 b8-c7, 14. d4:b6 c7:a5, 15, d2-c3 e7-d6, 16. c3-b4 d6-c5, 17. d4:b6 a5:c7, 18. f4-e5 d8-e7, 19. a3-b4 e7-d8, 20. e3-d4 d6:f4, 21. d4-c5 f4-e3, 22. f2:d4 c7-b6, 23. c5:d7 h6 g3, 24. f2:f4 g5: a3, 25. a7-b8D a3-b2, 26. g1-f2 b2-c1D, 27. f2-g3 c1-g6, 28. g3-h4 g5-f6, 29. b8-h2 h6-g5, 30. h2-b8. Нічыя.

Вынікі гульні ў чэмпіянаце: Эльця Юрчык+1—1, Дворкін выйграў у Гаркавіча+1½, Партыя Гардон—Прэсман яна скончана ў праігранym для Прэсмана становішчы.

Становішча турніру, калі астатнія партыя будзе выіграна:

1) Гардон+3½—3½; 2) Прэсман+11—4 3) Вакштэйн+8½—5½; 4) Барман+9½ —6½; 5) Элья+8½—9½ 6) Дворкін+ 7½—7½; 7) Юрчык+5½—6; 8) Гаркавіч+4—6; 9) Каспэрскі В. +4 —6; 10) Эціягер+2½—6½; 11) Ліхадзеўскі+2 —7.

Гомель. Матч на першынства ў горадзе між пераможнай турніру Рудзіным і майстрам Міроціным скончыўся, як і трэба была чакаць перамогай Міроціна—з рэзультатам +8—4!! Такая рашучая перамога сьведчыць, што Рудзін перамог у турніры выпадкова.

Увага для ігракоў шашачнага чэмпіянату: Чэмпіянат павінен закончыцца да 10-12—8. Недаіграныя партыі будуць лічыцца, як прайграш.

## Апавяшчэньні.

**— У пятніцу, 10 жніўня, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні летняга тэатру саду «Прафінтэрн» склікаецца сход парт. і праф. актыву для абгаварэньня 5-цігадовага пляну народнай гаспадаркі. Дакладчык—т. КАРКЛІН.**

**Члены ЦК, ЦКК, АК і АКК КП(б)Б, Бюро ЦК і АКК ЛКСМБ, РК КП(б)Б уваходзяць па сваіх мандатах.**

**Іншыя атрымліваюць білеты па РК КП(б)Б.**

**МЕНАКРУГКОМ КП(б)Б.**

### САД АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 8 жніўня, кіно „ОКТЯБРЬ" паст. рэжыс. Эйзэнштэйна. Пачатак а 9 з пал. гадз. увечары.

Білеты для членаў клюбу 10 кап., членаў саюзу—15 кап. У выпадку дрэннага надвор'я, кіно пераносіцца ў Дом.

Пачатак а 8 і 10 гадз.

— У чацьвер, 9-га жніўня, а 6 гадз. увечары ў памя